Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
6 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. ПЯТНІЦА №193 (28557)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Анімацыя: толькі для дзяцей?**

СТАР. 5




**Ведаць свае вуліцы**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**7 млн 664 тыс. тон**

*збожжа намалочана ў краіне ў 2017 годзе, што на 633 тысячы тон больш, чым летась. Масавая ўборка збожжавых і зернебабовых культур у цэлым па Беларусі (за выключэннем Віцебскай вобласці) была практычна завершана 1 верасня, заставаліся толькі невялікія плошчы культур (грэчкі і проса), якія ўбіраюцца пазней. Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых склала 35,6 ц/га — гэта вышэй на 2,2 цэнтнера, чым у 2016 годзе. Цяпер у краіне працягваецца ўборка бульбы, кукурузы на сілас, цукровых буракоў. Ужо ўбрана 71% плошчаў бульбы. Яе ўраджайнасць сёлета даволі высокая — 315,1 ц/га, што на 55 цэнтнераў вышэй за ўзровень мінулага года.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.10.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9629 ▼ |
| Еўра | 2,3103 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0341 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0732 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НОВЫ КРОК У СТРАТЭГІЧНЫМ ПАРТНЁРСТВЕ

## Прэзідэнт правёў перамовы з лідарам Венесуэлы

**Гадоў пяць-шэсць таму тэма супрацоўніцтва з Венесуэлай была на слыху ў Беларусі. У гэтай дзяржаве мы рэалізоўвалі вялікую колькасць праектаў у самых розных кірунках — ад нафтаразведкі і нафтаздабычы, будаўніцтва да гандлю і сельскай гаспадаркі. Сумесныя праекты рэалізоўваліся як на міждзяржаўным узроўні, так і на рэгіянальным. Супрацоўніцтва наладжана прыкладна з паловай венесуэльскіх штатаў (усяго іх 23). Аднак у апошнія гады тавараабарот пайшоў на спад: складаная ўнутраная сітуацыя ў Венесуэле, сусветны эканамічны крызіс налажылі свой адбітак. Настаў час пераламіць гэту тэндэнцыю.**

**З афіцыйным візітам Беларусь наведаў Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура. Учора ў Палацы Незалежнасці з ім сустрэўся і правёў перамовы кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# ВУЛІЦА СОНЕЧНАЯ, ДОМ 7




Жыхар вёскі Язна Мёрскага раёна Алег ВАЙЦЯХОЎСКІ будуе свой дом. Перад наваселлем, якое ўжо хутка, вырашыў прымацаваць адрас на сцяне новабудоўлі. Тым больш адрас — і лічба, і назва вуліцы — у новага дома сапраўды шчаслівы. Аднавяскоўцы Руслан НЯМІРА і Яўген БАЛАЙ часта дапамагаюць гаспадару на будоўлі і будуць жаданымі гасцямі на ўлазінах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Нестандарт

# «ЯНЫ Ў МЯНЕ ЖЫВУЦЬ, ЯК ЗУБРЫ...»

## Вясковец разводзіць кароў пад адкрытым небам

**У народзе кажуць «Карова ў цяпле — малако на стале». Гэтую прымаўку абвяргае Мікалай ЦІВУНЧЫК з вёскі Сэрвач, што на Карэліччыне. Мужчына круглы год трымае свой статак пад адкрытым небам без якой-небудзь паветкі, але ва ўсе сезоны атрымлівае ад скаціны малако. Пры гэтым выглядаюць жывёлы статнымі ды ладнымі...**

### ЗІМОЮ — НА САЛАМЯНАЙ ПОДСЦІЛЦЫ

Па адукацыі Мікалай шафёр. Як ён сам кажа, «вырас на каровах», з 16 гадоў кастрычнiку жывёл, умее іх лячыць. Больш за дзесяцігоддзе, з 1997-га па 2008-ы, быў загадчыкам жывёлагадоўчай фермы. Цяпер працуе там вартаўніком. Свой «дзікі статак» утрымлівае ўжо гадоў 15. Кажа, што такі метад гадоўлі падгледзеў у суседа, які ў сваё 70 дагэтуль трымае некалькіх жывёлін без хлява.

— Карову на вёсцы мець выгадна. На яе ў калгасе і сена дадуць на зіму, і корм на полі большую частку года расце — траціцца не трэба, і з малаком ды прадуктамі з яго будзеш увесь год, — гаворыць Мікалай. — На мой статак з 45 галоў, вядома, сена не выдзеляць — сам нарыхтоўваю, але ж я дамаўляюся са старшынёй калгаса. Папрасіш — дадуць і трактар, і касілку за невялікія грошы, а я ўзамен пустыя двары абкошваю, даглядаю, каб не было быльнягу.

СТАР. 4



Такія бычкі пamerам амаль з карову гадуюцца на прыродзе.

# НОВЫ КРОК У СТРАТЭГІЧНЫМ ПАРТНЁРСТВЕ

## Аднавіць былы ўзровень

Дэлегацыя з Венесуэлы на чале з першай асобай краіны наведвае сяброўскія дзяржавы — гэта сведчыць пра тое, што паступова там справы наладжваюцца, аднаўляецца патрэбны для народа парадак. Пра гэта заявіў на пачатку сустрэчы адзін на адзін з Нікаласам Мадурам беларускі лідар.

— Думаю, няма неабходнасці мне казаць пра пачуцці да венесуэльскага народа, да вас асабіста, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Больш як дзясятак гадоў гісторыі ўзаемаадносін. Мы заўсёды мелі пачуцці высокай удзячнасці і павагі да вас, вашага народа, вашай дзяржавы. У нас з вамі быў вялікі агульны сябар Уга Чавес, якога, на жаль, ужо няма...

Кіраўнік нашай дзяржавы абазначыў і асноўны пасыл сустрэчы:

— Нам трэба рашуча зрабіць добры новы крок наперад у развіцці нашых адносін. Мы да гэтага гатовы.

Нікалас Мадура прызнаўся, што яму вельмі прыемна быць у Беларусі:

— Мы ведаем, што знаходзімся сярод сапраўдных сяброў. Мы прайшлі часы войнаў, баталій, але ўмацаваліся ў гэтых баталіях. Зараз мы знаходзімся на этапе аднаўлення, якое таксама дастаткова складанае.

Так, у эканамічным плане ўрад Венесуэлы робіць новыя крокі. Прыняты план Праграмы баліварыянскага развіцця — так званая эканоміка постнафтавага перыяду. У межах гэтай праграмы кіраўнік Венесуэлы агучыў кірункі сумеснай працы з Беларуссю. Ён канстатаваў, што раней нашы дзяржавы плённа супрацоўнічалі.

— Цяпер мы хацелі б усё аднавіць, — падкрэсліў Нікалас Мадура. — У пакрокавым, спакойным рытме аднавіць узровень супрацоўніцтва. Мы прыехалі з надзеяй зрабіць гэта.

## Стаўка на рэальны сектар

Падчас пашыранага фармату перамоў кіраўнік нашай краіны падкрэсліў: Баліварыянская Рэспубліка Венесуэла — стратэгічны і вельмі важны партнёр Беларусі ў Лацінскай Амерыцы.

— За адносна кароткі гістарычны тэрмін нашы краіны стварылі надзейную палітычную і эканамічную базу двухбаковага ўзаемадзеяння. Сёння, разважаючы адзін на адзін аб сітуацыі, якая склалася ў нашых адносінах, мы канстатуем той факт, што нам нічога не трэба пачынаць з нуля. Трэба працягнуць тое, што мы ўмеем рабіць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У апошнія гады з-за складанай сітуацыі ў свеце тэмпы рэалізацыі сумесных праектаў знізіліся:

— Калі мы абмяркоўвалі гэтую праблему з Прэзідэнтам, адназначна канстатавалі факт, што нас не задавольвае гэта — ні беларусаў, ні венесуэльцаў. Сітуацыю трэба папраўляць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У Беларусі і Венесуэлы наладжаны доўгатэрміновыя гандлёва-эканамічныя і кааперацыйныя сувязі. Створана некалькі сумесных прадпрыемстваў: па выпуску аўтамабіляў, трактароў, здабычы нафты, газіфікацыі, будаўніцтве. Па беларускай тэхналогіі ў Венесуэле арганізавана вытворчасць дарожна-будаўнічай тэхнікі, пабудаваны найбуйнейшы ў Лацінскай Амерыцы цэглавы завод...

— Мы разам пабудавалі сотні тысяч квадратных метраў жылля для маламаёмасных грамадзян Венесуэлы, — канстатаваў беларускі лідар. — Гэта добрая аснова для нашых далейшых дзеянняў. Пачынаючы гэта некалі, мы дакладна трапілі ў цэль — развіваючы рэальны сектар эканомікі.

## Выйсце ёсць

Аднаўленне рэальнага сектара, дарэчы, вельмі неабходна Венесуэле.

— Мы гатовы разам з вамі працягваць гэты шлях у Венесуэле, — запэўніў беларускі лідар, успамінаючы ранейшыя часы, калі разам з Уга Чавесам і Нікаласам Мадурам былі вызначаны адпаведныя кірункі развіцця двухбаковых адносін з Беларуссю. — Пры гэтым я сказаў свайму сябру Прэзідэнту, каб ён праблему не перабольшваў. Так, у Венесуэле зараз няпроста, але ў нас было складаней. Мы гэтак жа дзялілі па талонах прадукты харчавання — пасля распаду Савецкага Саюза.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: тады мы паставілі перад сабой мэту максімум за 8—10 гадоў не толькі накарміць свой народ, але і выйсці на экспарт харчавання.

— І мы гэтую праблему за гэты час вырашылі, — адзначыў ён. — Венесуэла — пры жалезнай волі ўлады і дысцыпліне — гэтую праблему вырашыць за пяць гадоў. Мы гатовы ўдзельнічаць у гэтым працэсе і аказваць вам усямерную падтрымку як сваім самым блізкім і добрым сябрам.

Аляксандр Лукашэнка ўзгадаў той час, калі Венесуэла дапамагла Беларусі — тады ў нас былі праблемы з вуглевадародамі. Ён запэўніў: наша дзяржава пра гэта не забыла.

Кіраўнік беларускай дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі і Венесуэлы на міждзяржаўным узроўні створаны тры сумесныя камісіі. Яны не збіраліся некалькі гадоў. Лідары Беларусі і Венесуэлы дамовіліся, што ўжо ў лістападзе ў Мінску збярэцца сумесная беларуска-венесуэльская камісія:

— Я падключуся да вырашэння гэтых праблем, і мы намецім у лістападзе канкрэтны план нашых дзеянняў па вырашэнні пытанняў, якія ўзніклі ў нашых адносінах у Венесуэле і ў Беларусі. Я гатовы прыляцець у Венесуэлу, і мы з Прэзідэнтам яшчэ раз разгледзім гэты план і зацвердзім яго. Але мы дамовіліся яшчэ і пра тое, што, выпрацоўваючы гэты план, мы ні ў якім разе не павінны спыніцца і чакаць. Мы павінны працаваць па тых кірунках, па якіх сёння патрэбна працаваць, заключаючы канкрэтныя кантракты.

## Санкцыі бесперспектыўныя

Звярнуўся Аляксандр Лукашэнка і да пагрозы знешняга ваеннага ўмяшальніцтва ў справы Венесуэлы.

— Тое, што сёння Венесуэле пачалі пагражаць, дайшло да адкрытых пагроз ваеннага ўварвання ў гэтую суверэнную краіну... Хачу падкрэсліць, што мы катэгарычна супраць усялякай агрэсіі, супраць хаосу і беспарадку, супраць умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Венесуэлы і любой дзяржавы. Мы выступаем за вырашэнне любога канфлікту мірным шляхам. Нельга навязваць краінам рознага кшталту каляровыя рэвалюцыі.

Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены, што венесуэльцы самі ў стане разабрацца, што ім рабіць у сваёй краіне.

— Для кожнага чалавека, незалежна ад яго палітычных поглядаў, інтарэсы роднай краіны, мір, парадак у ёй — вышэй за ўсё, — заявіў беларускі лідар. — Венесуэльцы вельмі цвёрда адказалі на гэта пытанне. Санкцыі супраць Венесуэлы з боку пэўных геапалітычных сіл бесперспектыўныя і шкодныя — у тым ліку і для тых, хто ўводзіць гэтыя санкцыі.

## «Дарожная карта» рыхтуецца

Выступаючы перад прадстаўнікамі СМІ па выніках перамоў, Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падкрэсліў важнасць беларуска-венесуэльскіх адносін. Ён таксама заявіў, што наша дзяржава высока цэніць цвёрдую пазіцыю, якую Венесуэла займае ў ААН і іншых міжнародных арганізацыях.

— Вы рашуча выступаеце за выбудову шматпалярнага свету, гэта сугучна і нашай пазіцыі. Вы выступаеце за ўзаемавыгаднае і раўнапраўнае супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі, — канстатаваў беларускі лідар.

Па яго словах, цяперашні афіцыйны візіт Прэзідэнта Венесуэлы ў Мінск будзе садзейнічаць паглыбленню партнёрства паміж нашымі краінамі ва ўсіх сферах. Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што падчас перамоў яны з Нікаласам Мадурам абмяняліся меркаваннямі адносна ключавых кірункаў эканамічнага і палітычнага ўзаемадзеяння, вызначылі арыенціры на будучыню.

— На жаль, як мы канстатавалі, цяпер экспартна-імпартныя сувязі Беларусі і Венесуэлы не на тым самым высокім узроўні, на якім мы калісьці былі, — па розных прычынах, у многім не залежных ад Венесуэлы і Беларусі. Але патэнцыял дзвюх краін дазваляе значна ўмацаваць нашы адносіны, у тым ліку ў сферы эканомікі і гандлю, — упэўнены Прэзідэнт.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама паведаміў, што ідзе распрацоўка «Дарожнай карты» супрацоўніцтва дзвюх краін. Падрыхтоўка дакументаў павінна быць завершана ў найбліжэйшы час, а падпісаць іх плануецца падчас будучага пасяджэння Міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

---

# Прэзідэнт Таджыкістана можа наведаць Беларусь

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон учора падчас тэлефоннай размовы абмеркавалі стан і перспектывы развіцця двухбаковых адносін, паведаміла прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы.**

Прэзідэнты падкрэслілі зацікаўленасць у далейшым нарошчванні беларуска-таджыкскага супрацоўніцтва. Асаблівая ўвага была ўдзелена гандлёва-эканамічнай сферы, у тым ліку ўзаемадзеянню ў прамысловай і сельскагаспадарчай галінах, арганізацыі паставак тэхнікі ў Таджыкістан.

Лідары Беларусі і Таджыкістана таксама абмеркавалі ўзаемадзеянне краін на міжнародных пляцоўках і графік запланаваных адбыцца кантактаў. Аляксандр Лукашэнка запрасіў Эмамалі Рахмона наведаць з рабочым візітам Беларусь у межах правядзення сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ у Мінску. Адзначана, што візіт будзе спрыяць падтрыманню давернага палітычнага дыялогу, надасць імпульс гандлёва-эканамічным адносінам, пашырыць дагаворна-прававую базу.

Акрамя таго, падчас тэлефоннай размовы лідары дзвюх краін закранулі праблематыку міжнароднага і рэгіянальнага парадку дня. Кіраўнік беларускай дзяржавы цёпла павіншаваў свайго калегу з 65-гадовым юбілеем.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

---

■ Саюзная дзяржава

# Праграмы патрабуюць перамен

### У беларускай сталіцы абмеркавалі выкананне праграм Саюзнай дзяржавы

**У Мінску адбылося пасяджэнне Камісіі Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі па бюджэце і фінансах. Галоўным пытаннем стала абмеркаванне вынікаў рэалізацыі праграм Саюзнай дзяржавы, на якія выдаткоўваецца каля 70% сродкаў агульнага бюджэту.**

У старшыні камісіі Мікалая Ганчара, члена Камітэта Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі па бюджэце і падатках, ёсць пытанні па выкананні асобных праграм, напрыклад, па адной з іх, якая датычыцца комплекснага лячэння «чарнобыльцаў». Міністэрствы па надзвычайных сітуацыях дзвюх краін справіліся з пастаўленымі задачамі, як і Міністэрства аховы здароўя Беларусі, што пакуль нельга сказаць пра гэта ведамства ў Расіі. На думку Людмілы Дабрыннай, намесніка старшыні Камісіі Парламенцкага сходу, старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь па бюджэце і фінансах, варта мяняць падыходы да фарміравання Саюзных праграм: хутчэй распрацоўваць іх і прымаць, а галоўнае — правільна ацэньваць вынікі іх рэалізацыі.

Па папярэдніх звестках, у наступным месяцы адбудзецца яшчэ адно пасяджэнне камісіі ўжо ў Маскве, падчас якога плануецца разгледзець вынікі рэалізацыі Саюзных праграм з выканаўцамі як ад беларускага, так і ад расійскага боку.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

---

■ Блізкая ўлада

# ШЛАГБАУМЫ НА ВЫЕЗДЗЕ, або Як трапіць на кальцавую дарогу

**Дзевяць чалавек звярнуліся па дапамогу да старшыні Мінаблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ падчас асабістага прыёму ў Валожынскім раёне. Людзей хвалявалі самыя розныя тэмы: льготнага крэдытавання жылля, уладкавання вуліц, водаправода, атрымання кампенсацыі за згарэлы жылы дом. Два фермеры паскардзіліся, што сельгаспрадпрыемствы не разлічыліся з імі за пастаўленую прадукцыю. Накont апошняга ў Анатоля Ісачанкі сваё меркаванне: суб'ектам гаспадарання неабходна самім дамаўляцца, улада не павінна ўмешвацца ў іх узаемаадносіны.**



Іосіф Іванавіч узначальвае сялянска-фермерскую гаспадарку. Ён звярнуўся да губернатара з просьбай пасадзейнічаць у атрыманні дадатковых зямельных плошчаў.

— У мяне 690 гектараў ворыўных земель, але іх недастаткова для захавання севазвароту, — абгрунтаваў ён сваю просьбу. — Сёлета невялікімі плошчамі са згоды райвыканкама абмяняўся з сельгаспрадпрыемствам «Пяршаі-2003». Свой участак, дзе вырошчваў бульбу, аддаў пад збожжавыя. А на калгасным полі пасадзіў бульбу.

Фермер хацеў бы ўзяць дадатковыя гектары ў ААТ «Тарасава», якія мяжуюць з яго гаспадаркай і прыдатныя для вырошчвання гародніны. У «Пяршаях», дзе яму прапаноўваюць надзел, камяністая глеба, што патрабуе на яе апрацоўку дадатковых выдаткаў.

Генеральны дырэктар ААТ «Тарасава» растлумачыў, што не можа задаволіць просьбу фермера. У гаспадарцы 8 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, 24 тыс. свіней. Іх неабходна забяспечваць якаснымі кармамі, фуражным зернем.

«Паступім наступным чынам: даручу спецыялістам вывучыць сітуацыю наконт шчыльнасці жывёлы. Калі гэтай зямлі дастаткова, ёсць лішкі, то будзем думаць, як дапамагчы фермерскай гаспадарцы. Вядома, з улікам меркавання ўладальнікаў», — канстатаваў губернатар.

Абмен зямлі з улікам севазвароту кіраўнік цэнтральнага рэгіёна лічыць нармальным варыянтам, які павінен задаволіць абодва бакі. «Галоўнае, каб была агульная дамоўленасць і былі аформлены дагаворныя абавязацельствы», — падкрэсліў Анатоль Ісачанка.

Сяргей Дзмітрыевіч наракаў на тое, што нельга напрамкі выехаць на кальцавую дарогу Мінск — Гродна: члены садаводчага таварыства «Аір» загарадзілі выезд шлагбаумамі. Даводзіцца рабіць крук у дзевяць кіламетраў.

Дачнікі з «Аіра» лічаць, што гэтая дарога знаходзіцца на іх тэрыторыі і яны маюць права ёй распараджацца. У той жа час суседзі сцвярджаюць адваротнае: гадоў дваццаць ёй карысталіся ўсе таварыствы. Але, як аказалася, пытанне мае падводныя камяні. У 2016 годзе, калі ўвялі другое кальцо аб'язной трасы, на агульным сходзе члены таварыства «Аір» прапанавалі сваім суседзям скінуцца і за асабістыя грошы, талакой, уладкаваць дарогу, якая вядзе на шашу. Але ўсе адмовіліся. І тады «аіраўцы» ўзялі дазвол у Валожынскім райвыканкаме для ўсталявання шлагбауму.

Анатоль Ісачанка даручыў спецыялістам высветліць, па чыёй тэрыторыі пралягае шлях, і ўстанавіць мяжу. «Калі дарога належыць «Аіру», дамаўляецеся з ім. Калі не, то, зноў жа, трэба дамаўляцца і ўдзельнічаць па ўладкаванні праезду», — параіў губернатар.

Былі і іншыя пытанні, якія разглядаліся з удзелам старшыні Мінаблвыканкама.

Напрыканцы прыёму Анатоль Ісачанка, адказваючы на пытанні журналістаў, канстатаваў: «Пытанні, якія сёння ўзніклі, часткова павінна вырашаць мясцовая ўлада. Гэта іх кампетэнцыя. Сістэма выбудавана, яна працуе. Правы чалавека звяртацца ў органы ўлады — натуральны працэс. У кожнага заяўніка часам узнікаюць праблемы, добра, калі ён у стане справіцца з імі самастойна. Калі гэта не пад сілу, то ён звяртаецца да ўлады. І мы імкнёмся дапамагчы. Самае непрыемнае, калі пытанне, што ў кампетэнцыі таго ці іншага дзяржаўнага служачага, не знаходзіць рэагавання. На мой погляд, такія людзі не павінны тут працаваць».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

■ Цэны

# ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЯ ПАТАННЕЕ

**Пасля запуску атамнай электрастанцыі тарыфы на электраэнергію ў Беларусі знізяцца, паведаміў начальнік упраўлення энергаэфектыўнасці, экалогіі і навукі Міністэрства энергетыкі Сяргей ГРЭБЕНЬ.**

Ён лічыць, што з уводам АЭС сабекошт электраэнергіі будзе ніжэйшы, і тарыфы на электраэнергію для спажыўцоў у Беларусі знізяцца. Эксперты адзначаюць, што значнае зніжэнне тарыфаў адчуюць на сабе арганізацыі прамысловага сектара. Цяпер спецыялістамі прапрацоўваецца, у якім памеры будзе гэта зніжэнне. Міністэрства энергетыкі таксама вызначае новыя падыходы, каб стымуляваць выкарыстанне электраэнергіі ў вялікіх аб'ёмах. «Гэта не толькі электратранспарт. Мы прапрацоўваем усе кірункі для максімальнага выкарыстання электрычнай энергіі», — адзначыў ён.

Між іншым, Мінэнерга пасля запуску Беларускай АЭС не будзе згортваць развіццё аднаўляльных крыніц энергіі, але выступае за гарманічнае развіццё ўсіх крыніц энергіі, заявіў начальнік упраўлення. Прадстаўнік Мінэнерга звярнуў увагу на некаторыя асаблівасці ўстановак, якія працуюць на энергіі ветру і сонца, у прыватнасці іх залежнасць ад умоў надвор'я. «Выпрацоўку электраэнергіі ад іх мы зараз моцна не адчуваем, але да 2020 года з уводам АЭС аб'ёмы такой электраэнергіі будуць вялікія. Можна сказаць, практычна нерэгулюемай электраэнергіі, калі ёсць сонца і вецер, і яе трэба нейкім чынам паглынаць. У гэты перыяд працуюць і іншыя станцыі. Атрымліваецца, што мы павінны прыпыняць нашы энергаэфектыўныя станцыі. Таму размова ідзе аб гарманічным развіцці ўсіх відаў генерацыі, але не аб згортванні», — кажа начальнік упраўлення.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Першыя крокі

# ДАПАМАЖЫЦЕ РАЗАБРАЦЦА!

**«Ці лёгка быць маладым?» — гэта філасофскае пытанне стала лейтматывам сустрэчы, якую арганізавалі для маладых педагогаў Мінскі гарадскі камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі і камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама.**

Сёлета ў сістэму адукацыі сталіцы ўліліся 730 новых педагогаў. На сустрэчу прыйшлі 140 «навабранцаў», але крыху пазней падобныя сустрэчы адбудуцца для маладых спецыялістаў ва ўсіх раёнах Мінска. Пытанняў у іх заўсёды ўзнікае шмат. Напрыклад, усіх без выключэння цікавіць, ад якіх фактараў залежыць заработная плата? Ці можна паўплываць на яе памер? З якім стажам педагог можа прэтэндаваць на кваліфікацыйную катэгорыю? На якую матэрыяльную дапамогу могуць разлічваць іншагароднія педагогі, размеркаваныя ў сталіцу? Што павінна быць прапісана ў кантракце? Хто можа дапамагчы па-за сценамі навучальнай установы? Адказы на гэтыя пытанні давалі кампетэнтныя спецыялісты.

Між іншым, праблема замацавання маладых педагогаў на першым працоўным месцы для сталіцы па-ранейшаму актуальная. Нягледзячы на тое, што нямала хто з пачаткоўцаў... Няхай яна і не стаіць так востра, як яшчэ тры-чатыры гады таму, калі ў галіне заставалася не больш як 45% ад агульнай колькасці (сёння гэтыя паказчык дасягае 60%), тым не менш далёка не ўсе выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў звязваюць сваю будучыню са школай. Нехта спрабуе пасля заканчэння адпрацоўкі па размеркаванні самарэалізавацца ў тых сферах, дзе плацяць больш, дзе працоўны дзень строга рэгламентаваны, а выхадныя дні можна прысвяціць уласнай сям'і.

Даволі вострай з'яўляецца і праблема з жыллём. У Мінску пакуль дзейнічае толькі адзін інтэрнат для маладых педагогаў, прычым толькі для тых, хто яшчэ не мае сям'і. Але, па даручэнні старшыні гарвыканкама, месцы для педагогаў могуць выдзяляцца ў інтэрнатах прадпрыемстваў-шэфаў. Да таго ж сёлета гарвыканкам выдзеліў для педагогаў 75 кватэр. Маладыя спецыялісты могуць стаць у чаргу для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. (Многія педагогі-пачаткоўцы гэта ўжо ведаюць, іншыя даведаліся пасля сустрэчы.)Трэба заўважыць, што **ў сталіцы ўстаноўлены штомесячныя даплаты маладым спецыялістам у памеры адной базавай велічыні на працягу двух гадоў пасля заканчэння тэрміну працы па размеркаванні.** Пры заключэнні кантрактаў для маладых спецыялістаў прадугледжаны заахвочвальныя дадатковыя дні адпачынку.

Што датычыцца заработнай платы, то ў адукацыі дзейнічае складаная сістэма разліку. Спецыялістамі сацыяльна-эканамічнай службы прафсаюза быў распрацаваны ўніверсальны аўтаматычны анлайн-разлік стаўкі (акладу) для асобных груп работнікаў устаноў адукацыі сталіцы. **Яго можна знайсці на сайце гарвыканкама прафсаюза http://profobraz.by.** (Пры распрацоўцы пастараліся ўлічыць найбольш частыя пытанні і вострыя моманты, звязаныя з налічэннем зарплаты.)

Не так даўно з падачы Маладзёжнага савета Мінскай гарадской арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі вырашылася пытанне аб адтэрміноўцы ад службы ў арміі для маладых выкладчыкаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Добрым спосабам падтрымаць настаўнікаў-пачаткоўцаў у сталіцы лічаць прафесійныя конкурсы педагагічнага майстэрства, бо іх пераможцы маюць права на пазачарговае атрыманне кваліфікацыйнай катэгорыі. У маладых педагогаў у горадзе ёсць шмат магчымасцяў, каб сябе праявіць. Адна з іх — штогадовы конкурс «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі», дзе для старшакурснікаў педагагічных спецыяльнасцяў прадугледжана намінацыя «Педагагічны дэбют», а для педагогаў са стажам працы не больш як тры гады — намінацыя «Мы — маладыя». Да таго ж такія конкурсы ўплываюць як на якасць адукацыі, так і на імідж педагогаў у грамадстве.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

**ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ:**

- **Маладому спецыялісту абавязаны забяспечыць нагрузку не менш стаўкі, а зніжэнне нагрузкі магчыма толькі з яго пісьмовай заявы.**
- **Перавесці маладога спецыяліста на работу, якая не звязана з атрыманай спецыяльнасцю і прысвоенай кваліфікацыяй, да заканчэння размеркавання нельга.**
- **Здараецца, што маладым спецыялістам забараняюць сумяшчальніцтва, аднак гэта няправамерна. Яны маюць поўнае права сумяшчаць работу не толькі ў свайго непасрэднага наймальніка, але і ў іншай установе. Адзінае абмежаванне — не больш чым на 0,5 стаўкі.**

## ВАМ АБАВЯЗКОВА АДКАЖУЦЬ

**Па традыцыі ў суботу званкі жыхароў краіны будуць прымаць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны пастараюцца знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый.**

**Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу, 7 кастрычніка, правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8-016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСТНЁЎ. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8-023 275 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8-015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8-022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Ігар Віктаравіч ЮРКЕВІЧ. Тэл. 8-017 222 44 44.

# HD ЦЯПЕР І Ў БЕЛАРУСІ!

**Ужо амаль 14 гадоў тэлебачанне высокай дакладнасці працуе ў Японіі, ЗША, краінах Еўрасаюза. І ў нашых гледачоў, якія дагэтуль пераключалі каналы на спадарожніку або ў кабельнай сетцы і бачылі на экране вельмі якасны відэарад, які суправаджаецца пазнакай «HD», узнікала пытанне: «Ну, калі ж і ў нас з'явіцца ўласнае тэлебачанне з такім высокім раздзяленнем?» Зрэшты, лёд крануўся. Днямі пра пераход на HD-фармат вяшчання афіцыйна аб'явіў тэлеканал СТБ.**




— Для таго каб цэлы тэлеканал здолеў перайсці на новы фармат, спатрэбілася вельмі карпатлівая праца, — зазначыў **першы намеснік міністра інфармацыі Ігар ЛУЦКІ.** — Трэба было закупіць абсталяванне, падрыхтаваць тэхнічных спецыялістаў. І мушу сказаць, што тэлеканал з гэтай задачай справіўся выдатна. Тым больш што Прэзідэнтам пастаўлена задача, каб усе тэлеканалы Беларусі да лістапада 2018 года перайшлі на вяшчанне ў фармаце высокай дакладнасці. І цяпер СТБ дасць прыклад іншым каналам.

Праграмы з высокай якасцю карцінкі выходзілі на тэлеканале і раней. Але яны выкладваліся ў такім раздзяленні толькі на Youtube. З перадачай іх у эфір было складаней з-за апаратных абмежаванняў.

— Праект пераходу на HD — эвалюцыйны, — кажа **намеснік генеральнага дырэктара СТБ Кірыл КАЗАКОЎ.** — Мы абнавілі ўвесь тэхналагічны ланцужок — ад новых дэкарацый да апаратных комплексаў. Работа расцягнулася на некалькі месяцаў. У студыі з'явіўся ўльтрасучасны экран. Ён падтрымлівае магчымасць трансляцыі не толькі ў фармаце HD, але і ў 8K — яшчэ больш дакладным фармаце.

Што зменіцца для гледача? Калі ён карыстаецца дагэтуль старым аналагавым тэлевізарам праз лічбавую прыстаўку, то змяненне якасці сігналу будзе амаль незаўважна. Іншая справа — сучасны вадкакрысталічны экран, які зыходна «заточаны» пад карцінку высокай дакладнасці. Але і на гэтым тэлевізіёншчыкі спыняцца не збіраюцца.

— У наступным годзе мы плануем абнавіць нашу перасоўную тэлевізійную станцыю, — заўважае **намеснік генеральнага дырэктара СТБ Канстанцін АЎРАМЕНКА.** — Вядома, з прыцэлам на новыя тэхналогіі. Але гэта нават не HD. У свеце ўжо пачынае распаўсюджвацца тэхналогія 4K — тэлебачанне звышвысокай дакладнасці. Зразумела, гэта справа не аднаго і нават не двух гадоў.

**Даведка «ЗВЯЗДЫ».** *Сігнал тэлебачання высокай дакладнасці (HD TV) забяспечвае суадносіны бакоў тэлевізійнага экрана ў фармаце 16:9 і мае раздзяленне ў 1920 на 1080 пікселяў. Акрамя таго, такая сістэма дазваляе транслíраваць і шматканальны гук.*

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Кіраўнік Каталоніі: жыхары аўтаноміі расчараваны пазіцыяй караля Іспаніі па рэферэндуме

Карлес Пучдэмон адзначыў, што жыхары даверанай яму аўтаноміі глыбока расчараваны заявай манарха, якога яны заўсёды падтрымлівалі і паважалі. Грамадзяне Каталоніі чакалі і верылі, што кароль будзе заклікаць да дыялогу і згоды. Пучдэмон лічыць, што іспанскі манарх заняў бок прэм'ер-міністра краіны Марыяна Рахоя і цяпер нясе адказнасць за палітыку, што праводзіцца ў дачыненні да Каталоніі, якая стала катастрафічнай для аўтаноміі.

### У ЦРУ лічаць, што КНДР можа пайсці на новую правакацыю

КНДР можа пайсці на новыя правакацыйныя дзеянні 9 кастрычніка, калі ў ЗША адзначаецца нацыянальнае свята — Дзень Калумба. З такім папярэджаннем выступіў намеснік памочніка дырэктара ЦРУ Ён Сук Лі, выступаючы на канферэнцыі па пытаннях нацыянальнай бяспекі, якая прайшла ў сталічным Універсітэце імя Джорджа Вашынгтона.

Ён Сук Лі не стаў удакладняць, якіх правакацый можна чакаць ад Пхеньяна, але дадаў, што «часта ў Паўночнай Карэі запускі ракет або ядзерныя выпрабаванні прымеркаваны да нейкай буйной даты, якая адзначаецца ў краіне». А 10 кастрычніка ў КНДР будзе святкавацца чарговая гадавіна стварэння Працоўнай партыі Карэі.

«Так што будзьце напагатове і трымайце тэлефоны побач з сабой», — сказаў прадстаўнік ЦРУ.

Паводле яго слоў, аналітыкі галоўнага разведвальнага ведамства ЗША лічаць вельмі малаверагодным тое, што лідар КНДР Кім Чэн Ын адважыцца пачаць вайну з ЗША ці іх саюзнікамі, напрыклад з Паўднёвай Карэяй. «Кім Чэн Ын вельмі рацыянальны палітык, — заўважыў Ён Сук Лі. — І апошні, хто хоча, каб на Карэйскім паўвостраве ўспыхнуў канфлікт, — гэта Кім Чэн Ын».

### У караля Саудаўскай Аравіі ў Маскве зламаўся залаты эскалатар, які замяняе яму трап




4 кастрычніка ў Маскву ўпершыню з афіцыйным візітам прыляцеў кароль Саудаўскай Аравіі Салман бен Абдэль Азіз Аль Сауд. Ва ўрадавым тэрмінале Унукава-2 падчас спуску караля заклініла залаты эскалатар, які замяняе яму трап. Прыстасаванне кароль пастаянна возіць з сабой.

Манарх праехаў на трапе некалькі секунд, потым той спыніўся. Салман бен Абдэль Азіз Аль Сауд пачакаў трохі і сам спусціўся па прыступках.

З аэрапорта кароль адправіўся ў гатэль. Для Салмана бен Абдэль Азіза Аль Сауда і яго світы раней былі выкуплены ўсе нумары гатэля Ritz-Carlton у Маскве, піша NEWS.ru.

Кароль звычайна падарожнічае з вялікай колькасцю суправаджальнікаў, а таксама возіць тоны рэчаў, каб весці звыклы лад жыцця. З сабой ён бярэ ў тым ліку аўтамабілі і два эскалатары, якія замяняюць яму трап. Так, падчас візіту ў Інданезію сёлета ў сакавіку караля суправаджалі 800 чалавек, у тым ліку 10 міністраў і 25 прынцаў. Перад візітам караля ў Джакарту з Саудаўскай Аравіі даставілі 459 тон рознай тэхнікі, у тым ліку два «Мерседэсы» S600. 63 тоны рэчаў пакінулі ў Джакарце, а 396 тон адправілі на курорт у Балі, дзе кароль збіраўся адпачыць.

■ Надвор'е

# МОКРА І ЗОЛКА

**Халоднае і сырое надвор'е чакаецца ў Беларусі ў гэтыя выхадныя, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень пад уплывам чарговай сістэмы атмасферных франтоў на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, па паўднёвай палове чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра складзе ад плюс 7 да плюс 13 градусаў. І надалей у выхадныя чакаецца пасеннаму сырое надвор'е, калі тэмпературны фон будзе ў межах кліматычнай нормы для гэтых дзён.

У суботу ў нас будуць гаспадарыць няўстойлівыя паветраныя масы, якія перамяшчаюцца з Балтыйскага мора. Таму пераважна па паўночна-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе 3—8 цяпла, удзень — ад плюс 8 да плюс 14 градусаў. 8 кастрычніка ўначы ў вобласці паніжанага атмасфернага ціску будзе пераважна без ападкаў. А ўдзень у нядзелю пад уплывам франтальных раздзелаў, у асноўным у заходніх і ўсходніх раёнах краіны, чакаюцца дажджы. У цэнтральных раёнах краіны дажджоў будзе няшмат. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 цяпла, удзень — ад плюс 7 да плюс 13 градусаў. Захаваецца ўплыў атмасферных франтоў і ў панядзелак. На большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, удзень будзе 7—13 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# «ЯНЫ Ў МЯНЕ ЖЫВУЦЬ, ЯК ЗУБРЫ...»



Мікалай ЦІВУНЧЫК і яго памочнік Бім.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Атрымліваецца ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. Кінутых падворкаў у вёсцы сапраўды шмат, і ўтрымліваць іх у чысціні калгасу цяжкавата. А тут дзе Мікалай абкосіць, а дзе — яго каровы. Суседкі-бабулькі самі нават просяць, каб рагулі прайшліся па іх участку, навялі парадак.

Тэрыторыя за дваром Цівунчыкаў і некалькіх суседніх, дзе каровы праводзяць зімуды кожную ноч, абгароджана электрапастухом.

— Трымаць кароў на прыродзе не складана. Галоўнае, каб вада была. За суткі ўзімку прыходзіцца вёдзер 200 з калодзежа выкручваць. Бывае, што пару гадзін чакаеш, пакуль ён зноў напоўніцца для наступнай пітной партыі, бо вычэрпваеш усё, — удакладняе гаспадар.

Каб статак нармальна сілкаваўся зімою, ім патрэбна каля 20 тон сена. Хоць з'есці яны могуць і салому, з якой Мікалай робіць падсцілку таўшчынёй 5—10 сантыметраў, каб каровы не ляжалі на снезе.

— Гной мне выкідваць не прыходзіцца — усё ў глебу сыходзіць, — дадае ён. — А як холадна, дык яны ўкладваюцца на салому шчыльненька, ледзьве не адна на адну, грэюцца.

Калі мароз не моцны, да 15 градусаў, гаспадар зусім не хвалюецца пра свой статак. Калі ж тэмпература апускаецца ніжэй, а карове настае час цяліцца, яна на суткі застаецца з цялём у хляве, каб яно высахла.

— Аднойчы карова днём дваіх прынесла, я іх тады яшчэ на поле ганяў, а якраз снег выпаў. Вечарам шукаць кінуўся, думаў — усё, загінулі. Не, нармальна. Пераначавалі ў хляве — раніцай на вуліцу ды растуць сабе пры карове, — успамінае Мікалай. — Ім значна горш, калі адліга: слота ды дождж, чым мароз. Яны ў мяне жывуць, як лось, алень, зубр — у дзікай натуральнай прыродзе.

Калі зіма мяккая, то гаспадар ганяе іх пасвіцца і да снежня, а, па яго словах, «снежань з паловай студзеня як перажыў, так далей, глядзіш, ужо і вясной запахла, дзень даўжэйшы, сонца цёплае днём».

## З МАЛАКА НА МЯСА

Спачатку Мікалай здаваў малако ад свайго статка. За літр меў ад дзяржавы 46 капеек. Два гады назад мусіў адмовіцца ад малочнага бізнесу, бо малакавоз прыязджаў у розны час і трэба было пільнаваць яго, а хто будзе скаціну ў гэты час глядзець?..

Цяпер прадае малако людзям (3-літровы слоік — 2 рублі, што значна танней, чым у краме), корміць ім парасят, сам п'е. Ад шасці кароў, якіх ён доіць раніцай ды ўвечары, атрымоўваецца за дзень у сярэднім 100 літраў малака.

— Даіў раней уручную 4—5 кароў, дык ажно рукі балелі. Пасля апарат купіў — лягчэй стала — карову за 3—4 хвіліны здойваю, — кажа гаспадар.

Цяпер Мікалай працуе толькі на мяса, таму каровы нейкі час не дазваляюць мне набліжацца, бо думаюць, што прыйшоў чарговы пакупнік іх сабе на ялавічыну адбіраць. Некаторыя нават гаспадара да сябе не падпускаюць. Аднак праз нейкі час жывёліны смялеюць, і неўзабаве я ўжо ледзьве не ў цэнтры статка.

Кароў, якіх упадабалі пакупнікі, Мікалай ловіць з дапамогай палкі з пятлёй на канцы, якой чапляе скаціну за рогі ці шыю. Нядаўна, кажа, прыязджалі грузіны, адразу пяцярых кароў на вяселле для 800 гасцей бралі.

— Займаюся гэтым па інерцыі не дзеля прыбытку. Увесь мой статак можна прадаць за 30 000 рублёў, аднак калі малочную карову людзям прадаеш, то за яе адну можна 2000 выручыць, — дзеліцца «мясной арыфметыкай» Мікалай. — Цялят выгадней прадаваць, бо за жывёліну да 100 кг разлічваюцца па жывой вазе па 4,50 рубля за кіло.

Некаторыя, дарэчы, спрабуюць узважыць карову ў сантыметрах. Мераюць скаціну ў даўжыню і праз гэта вызначаюць яе вагу, але Мікалай такому спосабу не давярае.

## ЛЕТАМ — НА ВОЛЬНЫМ ВЫПАСЕ

Летам статак Цівунчыка шчыруе на 40 гектарах пашы каля ракі Сэрвач. З аднаго боку тут рака, з другога — доўгая ды глыбокая канава, праз якую проста так не пяройдзеш. Раней гэтак жа, паміж канавамі, і калгасныя статкі пасвіліся. Некалькі разоў за дзень Мікалай наведваецца паглядзець, дзе яго жывёлы. Зусім бескантрольна пакідаць іх, кажа, нельга.

Да сямі раніцы статак звычайна ўжо на месцы, назад кароў гаспадар стараецца вяртаць да цемнаты. Па дарозе скаціна яшчэ і паабапал шляху траву «абкошвае». Амаль усе каровы стрыножаныя, каб не надта разбягаліся па полі.

Штогод у статку нараджаецца каля 15 цялят. Дарэчы, хоць пасуцца каровы недалёка адна ад адной, цяліцца яны адыходзяць на некалькі кіламетраў.

— Бывае, расцеліцца карова ў полі, дык тое цяля пару тыдняў не адшукаеш, бо хаваецца па кустах, пакуль мамка яго сама ў статак не прывядзе. Нават калі будзеш за каровай сачыць, з раніцы прыгнаўшы іх на поле, яна да цяляці не пойдзе, калі ўбачыць, што ты назіраеш.

Дапамагаюць ганяць жывёл на пашу ды дахаты тры сабакі. А яшчэ ў Мікалая надзейная падтрымка з жонкі Людмілы, што працуе на ферме даяркай, і трох сыноў. 21-гадовы Мікіта нізавошта не хоча ехаць у горад, сярэдні Ігнат у свае 19 адпрацаваў год у Мінску і таксама вярнуўся на радзіму, малодшы Ілья цяпер у 10-м класе.

— Прывыклі дзеці да вёскі. Паедуць на пару дзён у горад ды назад уцякаюць, як я іх туды ні пхну. Мне здаецца, там лепш, у горадзе, напэўна. І выхадныя ёсць, — уздыхае Мікалай.

У гаспадарцы Цівунчыкаў яшчэ два кані і два жарабяці. На адным гаспадар сам працуе, што трэба прывезці ці ўзараць, другі — амаль увесь час у людзей, што каму трэба ў агарода зрабіць.

— Не дзеля прыбытку каня пазычаю, а каб чалавек на вёсцы выжыў. Ёсць тыя, хто можа аддзячыць чым, а ў кагосьці і даць няма чаго, дык што ж, не дапамагаць ім? — тлумачыць руплівы гаспадар, які сам, дарэчы, не п'е і не паліць, як і тры яго сыны.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

**Гадаванне кароў пад адкрытым небам — з'ява не новая. Яшчэ ў сярэдзіне XVIII стагоддзя на захадзе цэнтральнага раёна Францыі ў правінцыі Лімож, які адметны суровымі зімамі і традыцыйнай жывёлагадоўляй, разводзілі кароў, чыя парода па назве мястэчка атрымала імя лімузінская.**

**Гэтыя жывёлы лёгка пераносяць мароз у 20—35 градусаў і мяцеліцы пры ўмове наяўнасці грубых кармоў і абавязковай засцярогі ад ветру. Яны прыстасоўваюцца да розных кліматычных умоў і могуць харчавацца на пашах з кароткай травой, у тым ліку на горных лугах. З прычыны такой непатрабавальнасці і высокай пладавітасці, а таксама добрых мясных якасцяў гэтай пароды цяпер яе разводзяць у 70 краінах свету на пяці кантынентах, у тым ліку і ў Беларусі славутыя «лімузіны». Праўда, гадуюць іх тут не зусім, а дакладней, зусім не так, як мелася ў Францыі.**

**Хоць кліматычныя ўмовы Францыі ды Беларусі адрозніваюцца, ды і такімі генамі, як лімузінскія, нашы мясцовыя кароўкі не валодаюць, тым не менш, як бачым, яны спраўляюцца.**



### Каментарый спецыяліста

**Уладзімір МЯДВЕДСКІ, загадчык кафедры гігіены жывёл Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, прафесар, доктар сельскагаспадарчых навук:**

— Продкі нашых свойскіх жывёл — ласі, казулі, зубры — круглы год ходзяць па лесе, аднак мы не маем ад іх ніякай прадукцыі. А свойскія жывёлы прызначаны для таго, каб атрымліваць ад іх мяса ды малако. Яны спешчаныя, і для камфортнага жыцця ім патрэбны ўмовы з тэмпературай ад нуля да 10 градусаў цяпла. Для гэтага абавязковы хоць бы хлеў, дзе яны схаваюцца да ветру, сцюжы і снегу. Інакш жывёле трэба аддаць энергію корму найперш на абагрэў свайго арганізма.

Калі гэта непрадукцыйная жывёла, якую выкарыстоўваюць для атрымання мяса ці аднаўлення статку, яна не патрабуе такога догляду і цяпла, як малочная. Многія гаспадаркі ў нашай краіне гадуюць жывёл пад адкрытым небам, робяць ім навес, аднак пры гэтым камфорту няма. Да таго ж іх трэба забяспечваць вадой, а ў халодных умовах яна будзе замярзаць, і жывёлы, як правіла, ядуць пры гэтым снег. Атрымліваецца непрадукцыйнае выкарыстоўванне кармоў.

У нас зімой бывае да 30 градусаў марозу — куды схавацца жывёлам, калі няма хлява? Яны збіваюцца ў гурты. Аднак гэта некамфортнае ўтрыманне, а нават, я сказаў бы, здзеклівае. Многія прыватнікі, каб зэканоміць на будаўніцтве памяшканняў, такім чынам спрабуюць утрымліваць жывёл. Аднак калі гэта малочная скаціна, якую трэба даіць у памяшканні абавязкова, такія жывёлы хутка выбракоўваюцца са статку, адпраўляючыся на мяса.

---

■ Знаёмцеся!

# Упершыню ў нас аўсянка-крошка!

## У Беларусі адзначаны новы від птушак, паведамляюць у грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны»

**Восеньская міграцыя птушак працягваецца, а гэта добры час для таго, каб бачыць у нашай краіне рэдкія віды, якія ідуць «транзітам» з паўночных краін на зімоўку. Такім маршрутам ляцела і маленькая аўсянка, якая зрабіла невялікі прыпынак на поўначы Беларусі.**

Першую аўсянку-крошку для Беларусі адлавіў арнітолаг Дзяніс Кіцель 2 кастрычніка ў Віцебскай вобласці на станцыі «Сасновы Бор». Птушка адлоўлена з дапамогай сетак. Інфармацыя з'явілася ў групе Birding Belarus.

У Еўропе аўсянкі-крошкі падчас міграцыі адзначаюцца рэгулярна, у тым ліку і ў краінах-суседках (Польшча, Латвія, Украіна). Так што беларускія арнітолагі даўно чакалі гэты від і ў нас.

— З'яўленне аўсянкі-крошкі — прадказальнае. Праўда, гэтай восенню я чакаў іншы новы для Беларусі від — кральковую пеначку, яна таксама дзесьці ёсць, — расказвае **арнітолаг Дзяніс КІЦЕЛЬ**. — Раніцай я ўбачыў незвычайную птушку і адразу падумаў: «Гэта нешта, чаго ў Беларусі дакладна не было». Мільганула думка, што гэта аўсянка-крошка. Адразу ж пагледзеў у вызначальнік і пераканаўся ў гэтым.

Птушка акальцавана і выпушчана, думаецца, яна працягвае свой шлях у выраі на зімоўку. Аўсянка-крошка — не першы від, які Дзяніс Кіцель адкрыў для Беларусі: на рахунку арнітолага іншыя віды птушак, стракоз, а таксама вавёркапалятуха, пра вяртанне якой праз 30 гадоў ён паведамляў вясной 2017 года.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ДАВЕДКА:



**Аўсянка-крошка (Emberiza pusilla) — від птушак сямейства аўсянкавых. Даўжыня цела — 13,5 сантыметра, маса — прыкладна 15 грамаў. Адметная прыкмета віду — невялікі памер і рудыя шчокі. Верхняя частка цела ўпрыгожана чорна-бурымі палосамі, ніжняя белая частка цела ўсеяная тонкімі чорнымі палосамі. Апярэнне самкі больш цьмянае, чым у самца. Аўсянка — пералётная птушка. Гняздуецца ў тундры Паўночнай Азіі і Паўночна-Усходняй Еўропы, а таксама на поўначы Нарвегіі і Швецыі. Зімуе ад Непала на ўсходзе да Кітая і Індакітая.**

■ Творчая гасцёўня

Алена ТУРАВА:

# «НАША КІНО МОЖА БЫЦЬ І ЖУРБОТНЫМ, АЛЕ ЯНО НЕ ПАВІННА ПАКІДАЦЬ ПАЧУЦЦЯ БЕЗВЫХОДНАСЦІ»

**Казачная анімацыя і чароўнае дзіцячае кіно патрабуюць чароўных высілкаў і казачных сродкаў. Больш за тое — таленту. Сёння айчынны кінематограф, у тым ліку дзіцячы, пакідае шмат пытанняў — дзе беларускія сямейныя фільмы і мультфільмы? Алена Турава, рэжысёр папулярных дзіцячых фільмаў, пагадзілася развеяць міфы пра тое, хто павінен шукаць сродкі на кіно, як змянілася прафесія кінематаграфіста і чаму складана працаваць з дзецьмі-акцёрамі.**



## ЗЛУЧЭННЕ МУЗЫКАЙ

**— Анімацыя — кіно дзіцячае. Ці згодны вы з такім стэрэатыпам?**

— Напэўна, з дзяцінства гэта і ідзе — быццам анімацыя ствараецца для дзяцей. Але анімацыя — гэта жанр, а тэма можа быць і дзіцячай, і прымітыўнай, і эпатажнай, і складанай. Мая першая анімацыйная стужка, знятая ў 25 гадоў, «Ілюзіён», была вельмі дарослай, нават філасофскай. Часам трапляеш на «Анімаёўку» ці іншыя фестывалі і заўважаеш, што анімацыйныя стужкі могуць быць вельмі дарослымі. Гэта, канешне, розныя катэгорыі: фільмы, якія складаюць у фестывальную абойму еўрапейскіх фестываляў, бываюць вельмі бязрадаснымі, дэпрэсіўнымі. Я ўпершыню зразумела гэта, калі трапіла на фестываль у Швейцарыі 15 гадоў таму — большасць стужак там былі змрочныя. Сёння я таксама адчуваю гэтую розніцу — еўрапейскае кіно больш змрочнае, нават калі там уздымаюцца добрыя тэмы. Я прытрымліваюся нашай, славянскай духоўнасці. Наша кіно можа быць і журботным, але яно не павінна пакідаць пачуцця безвыходнасці.

**— Сёння папулярнасць зноў набываюць мюзіклы — можна ўспомніць хоць бы Дэміяна Шэзела з яго «Ла-Ла-Лэндам». А што незвычайнага будзе ў вашай новай рабоце?**

— Мая група зараз працуе над анімацыйным мюзіклам, заснаваным на кнізе Генадзя Давыдзькі «Зоркі сёмага неба». Гэта будуць пяць частак, якія павінны аб'яднацца ў адзін фільм. Праект ужо меў некалькі ўвасабленняў — ёсць тэатральная пастаноўка, кніга, нават сцэнарый ігравога фільма — і ўсе гэтыя ўвасабленні адрозніваюцца адно ад аднаго. Мы не хочам паўтараў, таму прыдумалі канцэпцыю музычнай анімацыі — яркага маленькага шоу для людзей розных узростаў, якія любяць казку. Канешне, не будзе «наваротаў», як у Disney, але мы стараемся дадаць нейкія элементы драйву, накшталт песень, якім падпяваў бы глядач. Думаю, дарослым таксама будзе цікава паглядзець. Песні мы пішам адмыслова для фільма, выконваюць іх беларускія зоркі — Тэа, Святлана Бень, Дзядзя Ваня. У нас сапраўды зорны склад і разлік на моцныя артыстычныя галасы.



«Рыжык у Залюстроўі», 2010 г.

**— Вы выкладаеце ў Акадэміі мастацтваў. Хутка адбудзецца выпуск рэжысёраў анімацыйнага кіно. Якія парады даяце студэнтам?**

— Навучыць рэжысуры нельга — можна толькі падзяліцца досведам, распавесці пра нейкія памылкі ці дасягненні, але не зрабіць чалавека рэжысёрам. Калі ён не мае ўнутранай стрункі, значыць, у прафесіі чалавек наўрад ці рэалізуецца. Хоць сваю пазіцыю студэнтам я ўсё роўна імкнуся даносіць: кіно павінна мець адрасата. Калі фільм патрэбен толькі табе, падумай, ці трэба шукаць або выдаткоўваць чужыя сродкі — гэта вельмі дарагое задавальненне, у плане энергетыкі і часу — вельмі карпатлівая праца. Таму, калі ствараецца анімацыя, рэжысёр павінен «прыцэньвацца», для каго гэтае кіно, а людзям патрэбна надзея ў кінематографе, каб фільм пакідаў веру ў нешта добрае. Я магу прыгадаць шмат таленавітых фільмаў, якія расказваюць пра жорсткія тэмы, але пакідаюць прамень надзеі. Адзін з маіх любімых фільмаў Томаса Янга «Дастукацца да нябёсаў». Ён хоць і пра людзей, якім засталося жыць вельмі мала, але наскрозь пранізаны святлом. У мяне ёсць пачуццё, што некаторым стужкам менавіта гэтага святла і не хапае.

## ПРЫЯРЫТЭТЫ КІНЕМАТАГРАФІСТА

**— Якія галоўныя змяненні ў працы кінематаграфістаў за апошні час?**

— Праца творцаў у сацыяльнай сферы змянілася. Раней творчыя прафесіі былі элітныя і ў фінансавым плане, і па статусе. Затое засталося асноўнае пытанне, якое павінен задаваць сабе рэжысёр: «Гэта зрабіць нельга. А як можна?» З гэтым пытаннем заўсёды сутыкаешся, асабліва на ігравой пляцоўцы. У мяне такое было, калі запускаўся фільм «Кіндэрвілейскі прывід». Была заяўлена вельмі багатая першая сцэна, а сродкаў на яе не хапала. Таму трэба было замяніць сцэну, але замяніць на штосьці такое ж моцнае — мы прыдумалі замену за тыдзень. Няма рашэння — няма фільма. Я ўпэўнена, што рэжысёрскі талент — гэта 1%, усё астатняе — арганізацыйныя здольнасці, нервы. Такія ж праблемы датычацца і іншых прадстаўнікоў кінематаграфічнай прафесіі.

**— Многія рэжысёры адзначаюць, што пошук грошай для іх прафесіі — натуральная з'ява. Ці так гэта?**

— Пошук грошай — гэта не праблема рэжысёра, так не павінна быць. Гэта пытанне прадзюсарскае. Для мяне вялізная загадка, як прадаваўся мой «Рыжык у Залюстроўі», бо рэальна я яго сустракала і ў сеціве, і на розных каналах. Я ведаю толькі, што з інстытутам прадзюсарства ў нас вялікія праблемы — быццам нашы стужкі нікому не патрэбныя, але рэжысёры бачаць, што іх фільмы цікавыя публіцы. Прадзюсарства — таксама палка з двума канцамі, бо нярэдка кінематаграфісту даводзіцца цалкам падпарадкавацца прадзюсару. Адна справа, калі гэта сапраўды дасведчаны чалавек, які добра ведае аўдыторыю, мае кінагуст ці кінаадукацыю, а яшчэ і моцную інтуіцыю, і камерцыйную жылку... Але дзе знайсці такіх прафесійных людзей?

## ДЗІВА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**— Як вы прыйшлі ў дзіцячае кіно?**

— Я адчуваю, што гэта сфера, дзе я магу нешта сказаць. Я вельмі люблю гэты жанр і заўсёды гляджу ўсё новае, што з'яўляецца на экранах. Здарылася так, што мне прапанавалі зняць кіно пра тое, што робіць Дзед Мароз летам. Я пагадзілася, распрацавала ідэю. Дарэчы, яе «пазычылі» маскоўскія прадзюсары, толькі крыху перапрацавалі, але я аб гэтым не ведала. Але калі я пачала здымаць гэтае кіно, зразумела, што на кінастудыі не хапае магчымасцяў ажыццяўляць задуманае. Мы вырашылі зрабіць некаторых персанажаў маляванымі, бо я ўспомніла пра стужку Земекіса «Хто падставіў труса Роджэра?». Усё атрымлівалася, але мы многага не ўмелі — не ведалі, што такое храмакей, не ўмелі карыстацца графікай. Гэтае кіно атрымалася, можна сказаць, лікбезам для ўсіх супрацоўнікаў студыі — мы вучыліся ўсяму на пляцоўцы, і ў выніку менавіта дзякуючы гэтай стужцы кінастудыя выйшла на новы тэхнічны ўзровень.

**— Наколькі перспектыўнае дзіцячае кіно ў нашай краіне сёння?**

— Лічу, што дзіцячае кіно — вельмі перспектыўны жанр і больш чым запатрабаваны! Але я назвала бы гэта сямейным кіно, якое выпускаецца большасцю студый па ўсім свеце, настолькі яно папулярнае. Калі адкрыць праграму таго, што паказваюць у нашых кінатэатрах, больш за 70% — гэта сямейнае кіно. У нас чамусьці гэты жанр амаль не запускаецца — не таму, што няма каму такія фільмы ствараць, бо людзей, якія пагадзіліся б здымаць, дастаткова. Некалькі гадоў таму я сама спрабавала запусціцца з такім праектам, але не знайшла зацікаўленасці ў ім. Хоць я думаю, што сямейныя фільмы вельмі камерцыйна паспяховыя. Як глядач, я дакладна сказала б, што на такое кіно хадзяць — я і сама хаджу на яго ў кінатэатры. Я ўсё ж за тое, што трэба шукаць прарока ў сваёй Айчыне — калі ў нас ёсць нядрэнныя ігравыя фільмы, чаму б не прарэкламаваць іх? Нават на невялікія сродкі можна зацікавіць гледача ненавязлівай рэкламай. Наш глядач не ведае, што здымаецца ў Беларусі, адсюль і здзіўленне накшталт: «А кінастудыя яшчэ працуе?!» Вельмі крыўдна чуць: маўляў, што былі часы, калі Нячаеў здымаў добрае кіно, а цяпер нічога не адбываецца. Насамрэч на кінастудыі былі паспяховыя фільмы, нават мае — я дагэтуль атрымліваю ўдзячныя водгукі. І добра, што яны ёсць, бо рэжысёру патрэбна адчуванне, што ён працуе для кагосьці.

**— У анімацыйным кіно вы не праводзіце кастынгі акцёраў, але сутыкнуліся з гэтым на ігравой пляцоўцы. З дзецьмі-акцёрамі складана працаваць?**

— Канешне, анімацыйнае і дзіцячае кіно адрозніваюцца не толькі жанрава, але і сутнасна. У анімацыі ўсё робіцца рукамі, патрэбны майстры, але калі яны ёсць — намаляваць можна ўсё, у ігравым кіно праблем нашмат больш — і асвятленне, і бюджэт, і акцёры. Я працавала амаль з усім узроставым спектрам акцёраў — пачынаючы ад немаўлят і да ўжо дарослых. Былі дзеці, якія выдатна ігралі — ведалі словы назубок, заўсёды слухалі парады; былі хуліганы, якія так баяліся здымачнай пляцоўкі, што станавіліся цішэй вады. Кожнае дзіця — асаблівае, таму трэба шукаць адмысловыя падыходы. У «Кіндэрвілейскім прывідзе» ў мяне здымаўся маленькі акцёр, якому было тры гады. Гэта самы складаны ўзрост, бо дзеці быццам бы і чуюць, што ім кажаш, але робяць па-свойму, таму бессэнсоўна нават праводзіць кастынгі. У рабоце з нашым маленькім акцёрам дапамагалі толькі цукеркі ды шакаладкі — без усялякіх жартаў, мне прыйшлося карыстацца прыёмамі дрэсуры: прывязвала шакаладку да лёскі, каб хлопчык зрабіў так, як трэба было для фільма. Пасля нам рабілі кампліменты наконт таго, як таленавіта іграе наш акцёр, а насамрэч гэта было вялікім выпрабаваннем. Тады я яшчэ раз упэўнілася ў тым, што рэжысёрскія задачы вырашаць трэба любой цаной.



«Кіндэрвілейскі прывід», 2014 г.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР**



## Серада, 11 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.45** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.25** Зона Х (16+).
**9.10** — *Прафілактыка на тэлеканале.*
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Спявачка» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка.
**18.35, 19.20 Серыял «Жаночы доктар-3» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** «Патруль 113. За кадрам».
**22.15 Серыял «След» (16+).**
**0.05** Сфера інтарэсаў.
**1.05** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца. (12+).
**9.00, 19.10** Тэлебарометр.
**9.05** — *Прафілактыка на тэлеканале.*
**15.00** Два рублі. (12+).
**15.20, 23.00 Серыял «Іх перабылыталі ў раддоме». (16+).**
**16.20, 0.00** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05 Драма «Помста». (16+).**
**19.15** «Паненка-сялянка». (16+).
**20.30** «Бітва салонаў». (16+).
**21.25** «Багіня шопінгу». (16+).
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.05** «Нераскрытыя тайны». (12+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Капыткі з мачанкай.
**8.05, 15.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.35 «Маргарыта Назарава». Меладрама (16+).**
**9.00** — *Прафілактыка на тэлеканале.*
**15.15** «Гэты дзень».
**15.20 «Прызнанне ў каханні». Драма. 2-я серыя (12+).**
**16.20, 21.05** «Яны спявалі за Радзіму». «Нам нужна одна победа...»
**16.45, 21.30 «На ўсё астатняе жыццё...» Драма (12+).**
**17.55** «Легенды кіно». Аляксандр Абдулаў (12+).
**19.30** «Легенды беларускай эстрады». «Я вярнуся...» Віктар Вуячыч.
**20.10** «Камертон». Народны артыст Беларусі Міхаіл Казінец.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.45** «Песні пад гітару».
**23.00 «Геній». Меладрама. Частка другая (16+).**

### Беларусь 5

**8.00** — *Прафілактыка на тэлеканале.*
**15.00** Гульні «навырост».
**15.30** Козел пра футбол.
**15.50** Слэм-данк.
**16.20** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2018. Францыя — Беларусь.
**18.25** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2018. Агляд гульнявога дня.
**19.20** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Салават Юлаеў» (Уфа). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.45** Міні-футбол. Кубак УЕФА. «Сталіца» (Беларусь) — «Дынама-Масква» (Расія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.25** Міні-футбол. Кубак УЕФА. «Пескара» (Італія) — «Кайрат» (Казахстан).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** — *Прафілактыка на тэлеканале.*
**15.00, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Нюхач». (16+).**
**23.10** «Вячэрні Ургант» (16+).
**23.50** «Кім Філбі. Тайная вайна». Фільм 2-і (16+).
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**9.00** — *Прафілактыка.*
**15.00** «Дзіўная справа» (16+).
**16.05** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Салдаты і афіцэры» (16+).
**17.25** «Міншчына».
**17.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**18.35** «Тайны Чапман» (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».

**20.15 Маст. фільм «Прывід». (12+).**
**23.05 Фантастыка «Сутыкненне з бездання». (12+).**
**1.00 «Баец». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 16.15, 5.40 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**7.30** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**10.30** «Любімыя акцёры» (12+).
**11.35, 1.00 Маст. фільм «Мілы, дарагі, каханы, адзіны» (0+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** Серыял «Хатняя прыслужніца» (16+).
**14.25, 2.25** «Іншы свет». (12+).
**15.00** «Справы сямейныя» (16+).
**19.20 Серыял «Аддзел 44». (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Дачніца» (16+).**
**3.50 Маст. фільм «Волга-Волга» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.00** — *Прафілактыка на тэлеканале.*
**15.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**15.20** «Пакой смеху». (16+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**17.00, 20.00** Весткі.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
**22.10, 23.10 Серыял «Прынада для анёла». (12+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.01, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.00** — *Прафілактыка на тэлеканале*
**15.00** «Суд прысяжных». (16+).
**15.55, 19.40** Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**16.30 Серыял «ППС». (16+).**
**17.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.45 Серыял «Неўскі». (16+).**
**21.25 Серыял «Справа гонару». (16+).**
**23.25** «НЗ.by».
**23.45** «Вынікі дня».
**0.15 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 16.00, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30** Раніца на восьмым.
**10.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.00 Мюзікл «Чыкага» (16+).**
**13.00** «Самы добры дзень».
**16.05** «Мультпарад». «Дамба».
**17.00 Серыял «Дарагі доктар».**
**18.25 Серыял «Выратаваць боса».**
**19.15** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**19.50 Серыял «Карона» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Сем'янін» (12+).**
**23.10 Серыял «Затрымка ў развіцці» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Варонiны». (12+)
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+)
**7.40, 4.20** М/ф «Тры каты». (0+)
**8.00, 4.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**8.20, 4.55** М/ф «Чычылэнд». (0+)
**8.40, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30, 19.00** Серыял «Маладзёжка-5». (12+)
**10.40** Камедыя «Знаёмства з Факерамі». (12+)
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны». (16+)
**14.10, 20.10** Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+)
**16.45, 5.10** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай». (16+)
**17.50, 23.20** «Уральскія пельмені». (16+)
**21.20** Камедыя «Знаёмства з Факерамі-2». (12+)
**0.00** Серыял «Гульня». (16+)
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+)
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+)
**3.30** «Лаві момант». (16+)

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35, 8.05, 21.10** «Правілы жыцця».
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Валянціна Сярова.
**7.35** «Падарожжы натураліста».
**8.35, 22.20** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 18.30** «Назіральнік».
**11.10, 0.35** ХХ стагоддзе. «Інтэрв'ю прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Маргарэт Тэтчэр Цэнтральнаму тэлебачанню». 1987 год.
**12.05** «Геній».
**12.40, 23.20** Сусветныя скарбы.
**12.55** Штучны адбор.
**13.35** «Генрых і Ганна. Каханне, якое змяніла гісторыю». Дак. фільм.
**14.25** «Джардана Бруна». Дак. фільм.
**14.30** «Міхаіл Лермантаў. Таямнічая аповесць».
**15.10, 1.30** Легендарныя піяністы ХХ стагоддзя. Андраш Шыф.
**16.05** «Гіпакрат». Дак. фільм.
**16.15** «Пешшу...» Масква рускастыльная.
**16.40** «Блізкае акружэнне Валерыя Гаркаліна».
**17.45** «Астравы». Фаіна Ранеўская.
**19.45** Галоўная роля.
**20.00** Ступені цывілізацыі. «Тайны вікінгаў». Дак. фільм. 1-я серыя.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Абсалютны слых».
**23.55** «Кінескоп». 65-ы МКФ у Сан-Себасцьяне.
**2.25** «Дом мастацтваў». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлгогія» з Севам Наўгародцавым: «Рускі рок». 2004 год (16+).
**6.55, 8.30, 9.40, 11.00, 12.55, 14.20, 15.40, 17.00, 18.55, 20.20, 21.40, 23.00, 5.35** Музычная настальгія (12+).
**7.20, 13.20, 19.20** Маст. фільм «Прыгоды Электроніка». (12+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Абмежаваны кантынгент». 2006 год (16+).
**14.35** Маст. фільм «Страказіныя крылы». (16+).
**17.15** Праграма «Стыль». 1992 год (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**20.45** Маст. фільм «Матылёк». (16+).
**0.00** Маст. фільм «Будзь здароў, дарагі!» (16+).
**1.15** Тэлеспектакль «Альманах сатыры і гумару». 1980 год (12+).
**2.15** «Вячэрнія мелодыі». 1984 год (12+).
**3.00** Маст. фільм «Гарадскія падрабязнасці» (16+).

### EuroSport 1

**3.00, 6.30, 10.00, 12.00, 17.00, 19.00, 21.30, 0.35** Футбол. Юнацкі чэмпіянат свету (U-17).
**5.00, 8.30, 11.00, 14.00, 20.15, 23.30, 1.30** Веласпорт. «Тур Турцыі».
**6.00, 13.00, 18.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**9.30** Ралі. ERC. All Access.
**13.30** Футбол. «ФІФА».
**18.15** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**2.30** Watts.

### Кінакамедыя

**0.00** Камедыя «Трымай удар, дзетка». (12+).
**1.55** Камедыя «Ну ты і прыдурак!» (16+).
**3.35, 14.25, 15.10** Шоу «Камедыянты». (16+).
**4.10** Меладрама «Прасцячка». (16+).
**5.55** Камедыя «Каханне ўразнос». (16+).
**7.20** Камедыя «Манія велічы». (6+).
**9.15** Камедыя «Мільён для чайнікаў». (16+).
**11.00** Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі». (16+).
**12.30** Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі-2». (18+).
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**16.00** Меладрама «Гаспадыня «Белых начэй». (16+).
**17.55** Меладрама «8 першых спатканняў». (16+).
**19.30** Камедыя «Добры хлопчык». (12+).
**21.10** Камедыя «Вясельны пярэпалах». (16+).
**22.55** Меладрама «Увесь гэты джэм». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.00, 3.10** «Каралёк — птушачка пеўчая». Серыял (16+).
**10.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.15** «Сляпая» (12+).
**13.15** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 4.45** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.10** «Натуральны адбор» (12+).
**17.00** «Шчыра» (12+).
**17.55** «Другое дыханне». Серыял (16+).
**20.50** «Магазіна» (16+).
**21.50** «Рэвізора» (16+).
**22.55, 5.35** «Лінія абароны» (16+).
**23.25** «Легенда аб Шукальніку». Серыял (16+).
**0.10** «Анёлы і дэманы». Трылер (16+).
**2.20** «Гучныя справы» (16+).

### ТБ1000

**6.10** Незвычайныя прыгоды Адэль (12+).
**8.20** Іншыя (16+).
**10.25** Матрыца: перазагрузка (16+).
**13.10** Герцагіня (16+).
**15.25** Інтэрв'ю з вампірам (16+).
**17.50** Правілы здыму: метад Хітча (12+).
**20.10** Практычная магія (16+).
**22.10** Сем жыццяў (16+).
**0.30** Прыгажосць па-англійску (18+).
**2.30** Шанхайскія рыцары (12+).
**4.25** Як выйсці замуж за 3 дні (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Мне не баліць. (16+).
**8.30** Рэальны тата. (12+).
**10.30, 0.40** Прывітанне ад Кацюшы. 1—2-я серыі. (12+).
**12.35** Крымінальны квартэт. (12+).
**14.35** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-2. (12+).
**16.20, 4.20** Марафон для трох грацый. 1—2-я серыі. (12+).
**18.05** Каралёў. (12+).
**20.20** 2 дні. (16+).
**22.20** А зоры тут ціхія. (12+).
**2.45** Іван Царэвіч і Шэры Воўк-3. (12+).

### National Geographic

**6.00** Узлом Сістэмы. (16+).
**6.50, 17.10** Гульні розуму. (12+).
**7.35, 22.55** Код небяспекі. (12+).
**8.00, 10.20, 14.50** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.05** Шаша праз пекла. (12+).
**9.35, 14.05** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**11.50** Аўта-SOS. (12+).
**12.35** Космас: прастора і час. (12+).
**13.20, 20.15** Неверагодныя машыны. (12+).
**15.40** Лавец камет: місія «Разета». (6+).
**16.25, 0.05, 3.00** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**17.55, 21.00, 0.50, 3.50** Інстынкт выжывання. (16+).
**18.40** Выратаваць планету. (12+).
**21.45** Твар у твар. (16+).
**22.35** Зрабі або памры. (12+).
**23.20** Тайныя гісторыі. (16+).
**1.35, 4.35** З попелу. (12+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.30, 16.30, 23.30, 4.15** Склады: бітва ў Канадзе. (12+).
**11.00** Прапажы на продаж. (12+).
**14.00, 5.30** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**16.00, 23.00, 3.50** Платформа. (16+).
**18.00** Хуткія і гучныя. (12+).
**19.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Голыя і напалоханыя XL. (16+).
**0.00** Узрываючы гісторыю. (6+).
**1.00, 7.10** Вулічныя гонкі. (16+).
**2.00** Самагоншчыкі. (18+).
**2.55** Мадэль для зборкі. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** На гэтым тыдні прыемныя сюрпрызы і засмучальныя нечаканасці будуць у асноўным датычыцца работы, але ў некаторых выпадках — звязаныя са здароўем. У панядзелак і сераду ёсць рызыка залішне перагрузіць сябе зносінамі з вялікай колькасцю людзей. Лепш больш часу правесці ў адзіноце, займаючыся справамі. Вам будуць па сілах любыя задачы. Спрыяльны час, каб памяняць работу або сяброўскае кола. У другой палове тыдня чакайце пазітыўны зрух у фінансавай сферы.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні верагодныя нечаканыя змены ў той частцы жыцця, якая мае дачыненне да пытанняў кар'еры, але ці будуць яны станоўчыя, залежыць толькі ад вашай стараннасці. Калі перамога дастанецца адносна хутка, то трэба будзе асэнсаваць свой поспех і зразумець, што ж вы такое зрабілі, каб пры наступным мець магчымасць паўтарыць яго. Першая палова тыдня напоўнена перамовамі і сустрэчамі. Будзьце ўважлівыя, пераканайцеся, што вас разумеюць правільна, каб пазбегнуць цяжкасцяў у будучыні. На чацвер пажадана не планаваць буйныя пакупкі і здзелкі.



**БЛІЗНЯТЫ.** У першай палове тыдня асаблівага напружання на рабоце не прадбачыцца, таму з'явіцца больш вольнага часу, які лепш выкарыстоўваць для сябе, адкрываючы новыя магчымасці, выяўляючы свае творчыя здольнасці. Сярэдзіна тыдня прынясе змену настрою, вы станеце спакайнейшымі і больш пазітыўнымі, прачнецца цікавасць да працы. У канцы тыдня рыхтуйцеся да цікавага падарожжа або важнай справы, якая стане пачаткам у ланцугу вялікіх дасягненняў.



**РАК.** Забабоны, несвядомыя страхі, калі вы дасце ім волю, могуць сур'ёзна атруціць ваша існаванне. Не бярыце на сябе чужыя клопаты, нічога не адкладайце на потым — інакш будзе позна. Знаёмцеся з новымі людзьмі, пачынайце новыя праекты. У пятніцу пастарайцеся не звязваць сябе абяцаннямі і абавязацельствамі. У канцы тыдня схадзіце ў госці ці прыміце у сябе блізкіх сяброў: прыемна праведзяце час і даведаецеся нешта новае і карыснае.



**ЛЕЎ.** Пажадана прыцішыць ваш байцоўскі запал і працаваць у камандзе. Варта больш уважліва паставіцца да дзелавых праектаў. Якіх-небудзь непрадбачаных праблем тыдзень не абяцае. Рэалізацыя намечаных планаў павінна прайсці на добрым узроўні. Каб не сапсаваць адносіны з начальствам, у аўторак не прымайце нічога на веру, не слухайце дзеяннаў па праверцы атрыманай інфармацыі. Неардынарная ідэя ў пятніцу здольная даць штуршок, які дазволіць атрымаць максімальную карысць з сітуацыі, што склалася.



**ДЗЕВА.** Вашы задумы будуць рэалізоўвацца даволі лёгка, але толькі калі вы знойдзеце аднадумцаў. Вельмі вялікая верагоднасць быць заўважаным начальствам і ацэненым па заслугах. Можа ўзнікнуць сітуацыя, калі давядзецца адказваць не толькі за сябе, але і за іншых. Паспрабуйце не распыляцца на дробязі. Сканцэнтруйце ўсе намаганні для дасягнення адной, галоўнай на цяперашні момант, мэты.

# ШАШКІ

**Выпуск №47**

У канцы верасня ў Літве адбылося некалькі цікавых спаборніцтваў па шашках. З 17 па 22 верасня Вільнюс прымаў камандныя чэмпіянаты Еўропы сярод мужчын і жанчын па стаклетачных шашках. Спаборніцтвы праводзіліся па трох праграмах, і ва ўсіх беларускія шашысты заваявалі медалі рознай вартасці. Жаночая каманда ў складзе сясцёр Вольгі і Дар'і Федаровіч выйграла чэмпіянат у класічнай праграме, перамогшы сваіх саперніц ва ўсіх матчах, а ў хуткай праграме і бліцы заваявала сярэбраныя медалі. Мужчынская каманда ў складзе міжнароднага гросмайстра Сяргея Насевіча, майстроў Уладзіслава Валюка і Аляксея Куніцы стала другой у асноўнай праграме і выйграла бронзавыя медалі ў бліцы і хуткіх шашках.

23—24 верасня ў г. Шаўляй адбыўся чэмпіянат Літвы па рашэнні шашачных кампазіцый, які праводзіў САШКЛ (Саюз аматараў шашачнай кампазіцыі Літвы). Конкурс рашэнняў праводзіўся ў два туры. Удзельнікам было прапанавана 18 пазіцый у шашкі-100 і 12 пазіцый у шашкі-64. Паспяхова выступілі госці — мінскія майстры. Віктар Шульга — першынстваваў з адрывам, пацвердзіўшы свой леташні поспех і атрымаў званне чэмпіёна САШКЛ, Віталь Варушыла заняў трэцяе месца. Чэмпіёнам Літвы абвешчаны Віктар Студзянцоў (Вільнюс), які заняў другое месца ў агульным заліку.

Сёння для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя літоўскім шашачным кампазітарам Рымасам Мацкявічусам (Вільнюс).

№99

Белыя простыя шашкі: a7, b6, f6, g1, g5 (5).

Чорныя простыя шашкі: a3, c5, d4, e5, h4 (5).

№100

Белыя простыя шашкі: d6, e5, e7, g1, g7, h2 (6).

Чорныя простыя шашкі: a5, d2, e3, f4, f8, g3 (6).

№101

Белыя простыя шашкі: a1, a5, b6, c5, d6, g7 (6).

Чорныя простыя шашкі: a7, b8, c3, d4, e3, g3 (6).

№99



Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: Выпуск №46 ад 22.09.2017.

№97 d8, g5, d8, e5x.

№98 4641.37.29 (1924) 30, 39 (24, 24) 34X.

Дакладныя адказы даслалі І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (Мінск), А. Ліцьвінаў, В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Пятніца, 13 кастрычніка

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 2.05 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15 Зона Х (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.45, 19.20 Серыял «Жаночы доктар-3» (16+).**
13.10 Дзіцячы доктар.
13.45 Дзень у вялікім горадзе.
**14.45, 15.25, 17.05 Серыял «Спявачка» (16+).**
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
21.00 Панарама.
21.50 Клуб рэдактараў.
**22.35 Меладрама «Маці і мачаха» (16+).**
2.25 Дзень спорту.

### Беларусь 2

7.00 Тэлераніца. (12+).
9.00, 19.10 Тэлебарометр.
**9.05, 17.05 Драма «Помста». (16+).**
11.10 «Шыфры нашага цела». (12+).
**12.10 Серыял «Тут хтосьці ёсць...» (16+).**
14.10, 20.25 «ЛавЛавСаг». (16+).
**15.15 Серыял «Іх перабльталі ў раддоме». (16+).**
16.20, 0.15 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
19.15 «Паненка-сялянка». (16+).
21.25 «Багіня шопінгу». (16+).
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
22.05 «Бітва экстрасэнсаў. 16-ы сезон». (16+).

### Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Запечаны бурак.
8.05, 12.00, 20.00 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.20, 12.15 «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Маргарыта Назарава». Меладрама (16+).**
9.20, 14.40 «Хлапчукі». Драма (16+).
10.55 «Свята далёкай зоркі». Памяці паэта Веніяміна Блажэннага.
11.20, 17.55 «Легенды кіно». Уладзімір Этуш (12+).
12.20 «Вялікія мастакі». П'ер-Агюст Рэнуар (12+).
13.20 «Спатканне сяброў». Канцэрт.
14.15 «Сіла веры».
16.15, 21.05 «Яны спявалі за Радзіму». «Развітанне славянкі».
**16.45 «На ўсё астатняе жыццё...» Драма, заключная серыя (12+).**
19.30 «Скарына. Дзеля Бога і людзей». Заключны фільм.
20.10 «Камертон». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір Варапаеў.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.45 «Песні пад гітару».
23.00 «Час кіно».
**23.05 «Восеньская саната». Драма (16+).**

### Беларусь 5

7.45 Міні-футбол. Кубак УЕФА. «Сталіца» (Беларусь) — «Пескара» (Італія).
9.15 Спорт-мікс.
9.25 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Шахцёр» (Салігорск).
11.20 Авертайм.
11.50 Футбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2019 (U-21). Беларусь — Малдова.
13.40 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
14.10 Міні-футбол. Кубак УЕФА. «Дынама-Масква» (Расія) — «Кайрат» (Казахстан).
15.45 Змешаныя адзінаборствы. UFC.
17.30 Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2018. Агляд гульнявога дня.
18.25, 22.05 Спорт-цэнтр.
18.35 Хакей для ўсіх.
19.05 Авертайм. КХЛ.
19.25 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Нафтахімік» (Ніжнекамск). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
22.15 Спартыўныя танцы. Кубак сталіцы. Мінск-2017. Дзень другі.

### АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!» (12+).
**10.10 Серыял «Выдатніца» (16+).**
11.05, 13.05, 16.15, 18.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор» (12+).
12.05 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
13.10 «Давай пажэнімся!» (16+).
14.20 «Час пакажа» (16+).
**16.30 Камедыя «Каралева бензакалонкі» (12+).**
18.20 «Кантрольная закупка» (12+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
19.00 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.05 «Голас». Новы сезон (12+).
23.00 «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі (16+).
0.10 «Вячэрні Ургант» (16+).
1.05 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Мінштучына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
8.30, 18.35 «Тайны Чапман» (16+).
9.35, 17.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
10.40 «Тэрыторыя памылак» «(16+).
12.25, 22.10 «Глядзець усім!» (16+).
12.35 «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Фантастыка «У пастцы часу». (12+).**
15.55 «Вадзіць па-руску» (16+).
16.10 «Аўтапанарама» (12+).
16.50 «Скардзіцца дазваляецца».
17.10 «Адкрытая размова».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Кракадзіл Дандзі-2». (12+).**
23.05 «Тэорыя неверагоднасці — якія цуды былі на самай справе?» (16+).
**23.55 «Баец». Серыял (16+).**
1.30 «Бітва мутантаў. Каму дастанецца Зямля» (16+).

### МІР

**6.00, 17.10 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
7.30 Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35 Маст. фільм «Раз на раз не прыпадае» (12+).**
10.00 М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
10.15 «Любімыя акцёры» (12+).
**11.20, 3.20 Маст. фільм «Яна вас кахае» (12+).**
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Хатняя прыслужніца» (16+).**
14.25 «Іншы свет». (12+).
15.00 «Справы сямейныя» (16+).
16.15 «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**19.20 Серыял «Падстава». (16+).**
**23.15 Маст. фільм «Кашчэй Бессмяротны» (0+).**
0.20 «Трымайся, шоубіз!» (16+).
0.50 «Кашмар вялікага горада» (16+).
**1.20 Маст. фільм «Мальтыйскі крыж» (16+).**
**4.35 Маст. фільм «Клопатная гаспадарка» (0+).**

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 20.40 Серыял «Тайны следства». (12+).**
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
15.45 «60 хвілін». Ток-шоу.
17.35 «Лёс чалавека». (12+).
18.45 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
22.10, 23.10 «Гумарына». (12+).
**0.20 Маст. фільм «Бацька панаволі». (12+).**

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.01, 7.10 «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
9.45, 23.25 «НЗ.by».
10.20, 19.40 Дзённікі «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**10.25 Серыял «Ляснік». (16+).**
12.00 «Суд прысяжных». (16+).
13.25, 18.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.05 «Месца сустрэчы».
**16.30 Серыял «ППС». (16+).**
**17.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**19.45 Серыял «Неўскі». (16+).**
**21.25 Серыял «Справа гонару». (16+).**
**23.55 Серыял «Агенцтва схаваных камер». (16+).**

### 8 канал

7.00, 15.55, 19.40, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
7.05 «Сябры дзядулі Марка» (0+).
7.30 Раніца на восьмым.
10.30 М/ф «Іван і Мітрафан».
**11.00 Драма «Атака на Пёрл Харбар» (12+).**
**14.15 Серыял «Жорсткае каханне».**
16.00 «Мультпарад». «Сабака ў ботах», «Маленькі вялікі сабака».
16.30 «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**17.00 Серыял «Дарагі доктар».**
**18.45 Серыял «Выратаваць боса».**
**19.45 Серыял «Карона».**
20.50 «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Адплата» (18+).**
**23.10 Серыял «Затрымка ў развіцці» (16+).**

### ВТБ

06.00, 15.15 Серыял «Варонины». (12+)
7.20 «Дурні і дарогі». (16+)
7.40, 4.20 М/ф «Тры каты». (0+)
8.00, 4.40 М/ф «Фіксікі». (0+)
8.20, 4.55 М/ф «Чычылэнд». (0+)
8.40, 3.50 «Ералаш». (6+)
9.30 Серыял «Маладзёжка-5». (12+)
10.40 Трылер «Пахаваны жывым». (16+)
12.40 Скетч-шоу «6 кадраў». (16+)
13.00 «Паспець за 24 гадзіны». (16+)
14.10 Серыял «Два бацькі і два сыны». (16+)
16.45, 5.10 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай». (16+)
17.50 Анімацыйны фільм «Губка Боб Квадратныя Штаны». (0+)
19.40 «Уральскія пельмені». (16+)
21.20 Камедыя «Шалёны спецназ». (12+)
23.10 Жахі «Бабадук». (16+)
0.50 Серыял «Бязмоўны сведка». (16+)
1.50 Серыял «Закрытая школа». (16+)
3.30 «Лаві момант». (16+)

### Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15 Навіны культуры.
6.35 Пернікавы домік. «Тувінскія камнярэзы».
7.05 «Легенды сусветнага кіно». Марлен Дзітрых.
7.35 «Падарожжы натураліста».
8.05 «Расія, любоў мая!» «Натхненне нганасанаў».
8.35 «Мацільда Кшэсінская. Фантазія на тэму». Дак. фільм.
9.20 «Кінескоп». 65-ы МКФ у Сан-Себасцьяне.
10.20 Шэдэўры старога кіно. «Саша». Маст. фільм.
11.10 Гісторыя мастацтва. Аляксандр Бароўскі. «Канон у савецкім мастацтве: форма, ідэалогія, свядомасць».
12.05 «Ядзернае каханне». Дак. фільм.
12.55 «Энігма. Цімафей Кулябін».
13.35 «Тайны вікінгаў». Дак. фільм.
14.30 «Міхаіл Лермантаў. Таямнічая аповесць».
15.10 Легендарныя піяністы XX стагоддзя. Рыгор Сакалоў.
16.15 «Лісты з правінцыі». Лебядзянь.
16.45 Геніі і ліхадзеі. Сяргей Вітэ.
17.15 Юбілей Франчэскі Ярбусавай. «Франчэска і Юра. Эпізод вечнасці». Дак. фільм.
17.55 Сусветныя скарбы.
18.10 «Душачка». Маст. фільм.
19.45 «Шукальнікі». «Загадка рускага Настрадамуса».
20.30 «Лінія жыцця». Кацярына Мячэціна.
21.25 Кіно на ўсе часы. «Якія не спяць у Сіэтле». Маст. фільм.
23.30 «2 Вернік 2».
0.15 «З-за яго». Маст. фільм.
1.40 «Запозненая прэм'ера». Дак. фільм.
2.40 «Мена». М/ф для дарослых.

### Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
6.55, 8.20, 9.40, 11.00, 13.10, 14.35, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 0.55, 2.20, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20, 1.20 Маст. фільм «Прыгоды Электроніка». (12+).
8.45 Маст. фільм «Матылёк». (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «БГ. Доўгая дарога дадому». 2006 год (16+).
13.30 Маст. фільм «Абяцанне шчасця». (16+).
18.00 «Да і пасля паўночы». Ад 26.11.1988 года (16+).
19.55 Маст. фільм «Два галасы». (16+).
22.00 «Колба часу» (16+).
0.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Абмежаваны кантынгент». 2006 год (16+).
2.35 Маст. фільм «Страказіныя крылы». (16+).
5.15 Праграма «Стыль». 1992 год (12+).

### EuroSport 1

4.00, 7.30, 12.00, 23.05 Футбол. Юнацкі чэмпіянат свету (U-17).
5.00, 8.30, 11.00, 14.00, 1.30 Веласпорт. «Тур Турцыі».
6.00, 9.30, 13.00, 17.00, 2.30 Тэніс. Турнір WTA.
0.45 Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Кінакамедыя

0.30 Камедыя «Няўдачлівыя». (16+).
2.05 Камедыя «Манія велічы». (6+).
4.00 Камедыя «Трымай удар, дзетка». (12+).
5.50 Камедыя «Вясельны пярэпалах». (16+).
7.40 Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі». (16+).
9.10 Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі-2». (18+).
10.40 Камедыя «Добры хлопчык». (12+).
12.20 Меладрама «Увесь гэты джэм». (12+).
14.15 Меладрама «Сняданак у ложак». (16+).
16.00 Скетчкам «Паміж намі». (16+).
16.15 Камедыя «Сямейка Ады». (16+).
17.55 Меладрама «Гісторыя кахання, або Навагодні розыгрыш». (12+).
19.30 Камедыя «Супермозг». (16+).
21.30 Камедыя «Рассеяны». (0+).
23.00 Камедыя «Суперсціюард». (16+).

### ТБ3

6.00 М/ф (6+).
8.25 «Доктар І...» (16+).
8.55 «Каралёк — птушачка пеўчая». Серыял (16+).
10.30, 3.40 «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.10 «Сляпая» (12+).
13.10 «Варажбітка» (12+).
14.15, 5.10 «Паралельны свет» (12+).
15.15 «Трэндзі» (16+).
15.45 «Здзелка» (16+).
16.15, 2.10 «Рыжыя» (16+).
17.10 «13 знакаў Задыяка» (12+).
18.10, 1.20 «Бітва рэстаранаў» (16+).
19.10, 0.30 «Гучныя справы» (16+).
20.10 «Заўсёды гавары «Так». Камедыя (16+).
22.05 «Савецкія мафіі» (16+).
22.55 «Крымінальная фішка ад Генры». Драма (16+).

### ТБ1000

6.10, 17.45 Найлепшае ўва мне (12+).
8.40 Сур'ёзны чалавек (16+).
10.55 Акадэмія вампіраў (12+).
13.10 Вёска праклятых (16+).
15.15 Абуджэнне (12+).
20.10 Неверагодны Халк (16+).
22.20 Гордасць і прадузятасць (12+).
0.45 Забі мяне пяшчотна (18+).
2.35 Іншыя (16+).
4.20 Незвычайныя прыгоды Адэль (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Экватар. (16+).
8.05 Вар'яцкая дапамога. (16+).
10.25 Здзіві мяне. (16+).
12.05 Рызыка — высакародная справа. (6+).
13.40 Юр'еў дзень. (16+).
16.20, 4.20 Пагоня за трыма зайцамі. 1—2-я серыі. (12+).
18.20 Пацалунак скрозь сцяну. (16+).
20.20 Алёша Паповіч і Тугарын Змей. (12+).
22.05 На краі стаю. (16+).
0.05 Апельсінавы сок. (16+).
2.10 Мне не баліць. (16+).

### National Geographic

6.00 Узлом Сістэмы. (16+).
6.50 Займальная навука. (12+).
7.40, 23.30 Код небяспекі. (12+).
8.05 Астана: горад будучыні. (12+).
8.50, 11.05 Шаша праз пекла. (12+).
9.35, 16.25, 19.30, 0.40, 3.05 Расследаванні авіякатастроф. (12+).
10.20, 14.55 Мегазаводы. (12+).
11.55 Аўта-SOS. (12+).
12.40 Космас: прастора і час. (12+).
13.25, 20.15 Неверагодныя машыны. (12+).
14.10, 5.35 Навуковыя недарэчнасці. (12+).
15.40 Год у адкрытым космасе. (12+).
17.10 Чалавек супраць YouTube. (12+).
18.00, 21.00, 23.55, 1.25, 3.50 Тайныя гісторыі. (16+).
18.45 Фідэль Кастра: страчаныя плёнкі. (16+).
21.50 З попелу. (12+).
23.10 Зрабі або памры. (12+).
2.15, 4.45 Францыск-бунтар. (16+).

### Discovery

8.00, 17.00, 22.00, 4.40 Махінатары. (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 6.20 Як гэта ўстроена? (12+).
10.00, 16.00, 23.00, 3.50 Платформа. 1-ы сезон, 4-я серыя. (16+).
10.30, 16.30, 23.30, 4.15 Склады: бітва ў Канадзе. 1-ы сезон, 32-я серыя. (12+).
11.00 Рэальныя дальнабойшчыкі. (12+).
14.00, 5.30 Аляска: сям'я з лесу. (16+).
18.00 Хуткія і гучныя. (12+).
19.00 Залатая ліхаманка. (16+).
20.00 Гандляры космасам. (12+).
0.00 Разбуральнікі легенд: кастынг. (16+).
1.00, 7.10 Вулічныя гонкі. (16+).
2.00 Самагоншчыкі. (18+).
2.55 Мяцежны гараж. (16+).




## ПОЗНІЯ ЖУРАВІНЫ

Мой сусед — проста апантаны грыбнік! На ўсякім разе дадому з пустым кашом ніколі не прыходзіць. А пачнеш дзівіцца, распытваць, што ды адкуль, ён толькі ўсміхаецца, кажа, што і яму, і ўсім, хто любіць лес, адмысловы чараўнік дапамагае — каб са сцежак не зблізіся, каб не заблудзіцца, каб улегцы дамоў не прыйшлі... Завуць таго дзядка лесавічком.

Не паверыце, але я яго, здаецца, бачыла.

Па журавіны амаль штогод мы з сяброўкай адпраўляемся позна, пасля таго, як іх... пазбіраюць. І крыўды тут аніякай, бо менавіта ў кастрычніку падымаюць свае чырвоныя галоўкі і проста клічуць да сябе ягады, якія схаваліся ў мох ад жніўеньскіх ды верасьнёўскіх набегаў: спелыя, карысныя. Вось тады б і збіраць...

Аднак у той год мая сяброўка, занятая сваімі бясконцымі службовымі справамі, прыехала аж у канцы месяца. І надвор'е «выбрала» — не расказаць: ноччу добры марозік, раніцай — халодны дождж...

— Нічога, — скамандавала госця, — не размокнем. Апранаемся, едзем.

Яна ведала ўжо, куды: напярэдадні мясцовы ляснічы паказаў нам адну мясціну побач з шашой, дзе яшчэ трапляласе трохі ягад.

І вось мы з вёдрамі, як тыя два прывіды, у жоўтым і ружовым дажджавіках, брыдзём па балоце.

Дождж тым часам то мацнее, барабанячы па плашчах, то працыхае. Холад забіраецца пад вопратку, да яго далучаецца страх, бо міжволі прыгадалася, што некалі тут злучаліся два возеры і што невялікі адрэзак дарогі насупраць «злучэння» будаваўся куды даўжэй, чым многія вялікія, бо ўсё, што насыпалася днём, ноччу бясследна знікала. Прычым казалі, што прападаў, праваливаўся не толькі пясок ды коні, а нават людзі, пакуль адзін з інжынераў не здагадаўся палатно дарогі абкласці мяшкамі з цэментам і толькі потым закідваць сярэдзіну...

Ад гэтых успамінаў мне стала зусім не па сабе. Я вырашыла падацца бліжэй да сяброўкі і раптам амаль побач убачыла... дзядка.

Ён таксама нас згледзеў, падышоў, з хітраватай усмешкай стаў пытацца, адкуль мы ды на чым прыехалі, колькі журавін назбіралі...

Пра тое ж спыталіся і мы. Дзядок сказаў, што з'явіўся... ні зблізку, ні здалёку (?), што журавін хоча набраць хіба ў капусту, што боты і ровар пазычыў (?) у вёсцы.

Карацей, нейкі дзіўны стары. Але ж мы з ім трохі пагаварылі і разышліся. Я адвяла сяброўку туды, дзе толькі што бачыла некалькі прыгожых купін. Не паспелі мы сагнуцца, каб пазбіраць ягад, як дзед — ні села, ні пала — зноў «намаляваўся» побач. «Ну і якога ж ражна?» — не без злосці падумала я і сябе ж прысароміла: стары чалавек, захацеў набраць журавін, а сам, відаць, не знаходзіць... Можа, недабачыць ці што? Трэба дапамагчы...

Сяброўка, як потым сказала, падумала пра тое ж. І мы ўжо разагнуліся, каб адсыпаць старому ягад, але ён... як скрозь зямлю праваліўся, мы аглядзелі ўсё.

— Трэба і нам сыходзіць, — сказала сяброўка, — бо толькі намерзнемся. Журавін усё роўна няма.

Яна першай пакіравала ў бок машыны.

Але што гэта? Амаль побач, у нас пад нагамі, былі не проста купіны, — цэлыя курганы, аж чырвоныя ад ягад.

— Мы ж з табой тут хадзілі, — нічога не разумеючы казала сяброўца я. — І журавін не было?

— Так, — лыпала вачыма яна.

— Адкуль жа ўзяліся? Быццам, насыпаў хто?

...Лесавік, не лесавік — нам заставалася хіба іх пазбіраць, напоўніць (!) вёдры і шчаслівымі паехаць дамоў.

**Іаланта Валуевіч,**
*м. Хацежына, Мінскі раён.*

## ЁСЦЬ ТЫЯ ХАТКІ, ШТО НЕ ВЕДАЮЦЬ ЗВАДКІ

Жылі-былі двое — ён і яна, добрая, прыгожая пара: адзін ва ўсім стараўся дагадзіць другому, нечым прыемна здзівіць, парадаваць і, калі тое ўдавалася, абое былі на сёмым небе ад шчасця, хоць жылі зусім небагата: грошай хапала ад зарплаты да авансу і тое толькі таму, што ашчаджалі кожны рубель.

— А каб жа стрэльбу купіць, — час ад часу марыў гаспадар, — я б па выхадных стаў на паляванне хадзіць, можа, дармавога мяса калі здабыў бы, можа, лісу на каўнер падстрэліў?

Як быццам важкія былі аргументы? Апроч таго, жонка проста хацела дагадзіць свайму чалавеку. Вось і зэканоміла пэўную суму, прыдбалі яны ружжо.

Радасці ў той дзень было — аж пад столь: мужу ад таго, што пойдзе на паляванне, жонцы — што спраўдзіла мару...

Але ж на сваю галаву, бо пасля таго яе гаспадар ці не кожную вольную гадзіну стаў бегаць на паляванне.

Што заставалася ёй? Ну вядома ж — чакаць. І чаго ўжо тады не думаць: то ўяўляла, як на мужа (бронь Божа!) напалі дзікі ці ваўкі, то — што яго (ну бывае ж!) выпадкова паранілі іншы паляўнічы, то — што зблудзіў ён і дарогі знайсці не можа...

Не без падстаў былі хваляванні.

У той выхадны ўжо зранку гуляла мяцеліца. Жонка напраміла бог прасіла, каб муж застаўся дома, нікуды не ішоў. Ды дзе там: усё роўна пацягнуўся — у лес за суседнюю вёску. «На гадзінку», — сказаў. Але ж і дзве прайшлі, і тры, і чатыры... Кабета счакалася, знервавалася і не вытрымала — пабегла да суседа, стала прасіць, каб запрог каня, каб паехаў з ёю шукаць паляўнічага, бо калі звечарэе...

Едуць яны, значыць, амаль па цаліку, ва ўсё горла свішчуць, крычаць... Але ж бачаць — нешта, як быццам, варушыцца? Так і ёсць — «снежны чалавек»! Стомлены, замерзлы, ледзьве жывы!

Бервяном, можна сказаць, яго ўкінулі ў воз, укрылі кажухамі, прымчалі ў цёплую хату. Гаспадыня адразу ж давай распранаць, адпойваць гарачым ды расціраць гарэлкай...

Гаспадар жа толькі сапе і маўчыць: рады, што жывы, што дома. Жонка таксама язык праглынула, хоць, здаецца, сказала б... Ды што там — нават забіла б!

Але ж вось скончыла яна «працэдуры», убачыла, што, здаецца, усё абышлося. І ўжо тады расчыніла дзверы, схапіла стрэльбу і як бразне яе за парог!

Грукату было на ўсю хату! Патроны паляцелі ў адзін бок, ружжо ў другі, амуніцыя следам...

Гаспадар (хоць душа і балела) усё роўна маўчаў.

...Карацей, звечара яны не пасварыліся. А нараніцу ўжо разам, удваіх, з рогатам поўзалі па падлозе ў сенях, па адным збіралі патроны; муж правяраў, ці спраўная стрэльба.

Абое пры гэтым пачувалі сябе вінаватымі і абое рабілі высновы. Напэўна, таму ў іх хаце аніколі больш не было калатнечы.

**Раіса Васільева,**
*г. Гомель.*

## НЕПЕДАГАГІЧНЫ ПРЫЁМ

Гэтую гісторыю я неяк расказаў свайму сябру. Той выслухаў, пасмяяўся ды кажа:

— О, дык гэта ж для «Звязды», для рубрыкі «Народ на провадзе!»

Можа, і сапраўды?

...У 80-я гады мінулага стагоддзя працаваў я настаўнікам фізкультуры ў сельскай дзевяцігодцы. Класы тады былі вялікія, у асобных — хлопчыкаў нават больш, чым дзяўчынак. А гэта ж сіла, калі браць, напрыклад, падлеткаў.

Якраз іх, старшакласнікаў, па восені і... узялі (ну вядома ж, разам з настаўнікамі) у калгас, на ўборку ўраджаю.

І вось работа ўжо закіпела: хлопчыкі ішлі паперадзе — рвалі буракі, дзяўчынкі следам церабілі іх ды скідвалі ў кучы. Потым пад'язджаў трактар з прычэпам, і вучні, усе разам, пачыналі пагрузку...

Не ў памяці, колькі трактароў ужо ад'ехала, але ж пасля чарговага ўсе захацелі адпачыць — пасядзець, перакусіць, а нічыйныя, можна сказаць, хлопцы з дзявятага (іх ранейшую класную абралі старшынёй сельсавета, а новую пакуль не прызначылі) нават згуляць у «дурня». «А што? Няхай, — не зважалі настаўнікі. — Гэта ж не ў школе ды ў час адпачынку...»

Але вось ён скончыўся, усе дзеці дружна пайшлі працаваць. І гэтых карцёжнікаў настаўнікі клікалі, нават не раз...

Тыя, што называецца, і вухам не вялі — рэзаліся ў карты!

— Фёдар Аркадзевіч, ну скажыце *вы* ім, — сталі прасіць мяне калежанкі (мужчын у школе і тады амаль не было). — Можа, вас паслухаюць?

— Я што — дырэктар ці завуч? — запярэчыў спачатку.

— Не, — згадзіліся жанчыны, — але ж вас яны паважаюць.

Гэта — што казаць — было праўдай, бо я, на той час адносна малады, сам гуляў з дзецьмі ў футбол ды тэніс, сам вазіў іх на розныя спаборніцтвы (той клас выйграваў раённыя спартакіяды, двое вучняў гулялі за зборную вобласці па настольным тэнісе)...

Але ж тут, на полі, паводзілі сябе зусім не па-спартыўнаму: дзяўчаты, меншыя за іх вучні ўжо збіраліся грузіць чарговы прычэп, а гэтыя бэйбусы працягвалі рэзацца ў дурня!

Іх трэ было неяк спыніць.

Карацей, я падаўся да хлопцаў, рассунуў плечы гульцоў, сказаў:

— Ну, хто тут картуе? Раздавайце і мне...

Вучні спачатку разгубіліся, нехта шапнуў, што, маўляў, не трэба, але ж многія ўжо ўсміхаліся, пыталі:

— А вы ўмееце? А не баіцеся? Тады сядайце!

Я сеў, гульня пачалася, да мяне ход: карта ляжыць у цэнтры круга, але я яе пабіць «не магу». Цягну — адзін раз, потым яшчэ і яшчэ...

Дзеці вакол паціраюць рукі і толькі што не скачуць ад радасці! Ну як жа настаўнік вось-вось атрымае дурня! Можа, нават з пагонамі...

Так яно ўрэшце і выйшла: я «атрымаў». Уся калода карт апынулася ў мяне.

Я для прыліку іх патасаваў (даў гульцам пасвяткаваць перамогу), а потым... схаваў у кішэнь. Сказаў:

— Усё, хлопцы — пагулялі і до. А зараз — за работу.

Вучням нічога не заставалася, як згадзіцца і ўстаць з наседжаных месцаў.

...Калі я падвёў іх да працуючых, усе здзівіліся.

— Як вам удалося? — спыталі настаўнікі.

— Гэта непедагагічны прыём, — адказаў я. — Ва ўсякім разе — не жаночы.

...Цяпер многія з тых карцёжнікаў ужо сталі дзядамі, але для мяне яны па-ранейшаму хлопцы. Пры сустрэчах мы ахвотна ўспамінаем школу і, дзякаваць богу, застаёмся сябрамі.

**Ф. А. Карпей,**
*г. Мядзел.*

Рубрыку вядзе
**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# ПАД РУКУ З ГІСТОРЫЯЙ



### Як разгадаць таямніцы старых вуліц

Гуляць па Верхнім горадзе ў Мінску, асабліва такой восень адбелай слатой, — адно задавальненне. Утульныя вузкія вулкі, на якіх на нейкі момант, страціўшы пільнасць, можна і заблудзіцца, дакедзеныя да ладу старыя будынкі, у якіх паўсюль кавярні, дзе вараць густую аксамітную каву і самы восеньскі напой — глінтвейн. Праўда, ідылію старога горада дзе-нідзе парушае шум будаўнічай тэхнікі: яшчэ не ўсюды скончаны рамонт, да маразоў спяшаюцца пакласці плітку на яшчэ не забрукаваных участках. Але на гэтыя нязручнасці глядзіш з усмешкай, бо ведаеш, што яны часовыя і прыбліжаюць той момант, калі Верхні горад ва ўсёй сваёй адрамантавана-адрэстаўраванай дасканаласці стане закончаным архітэктурным ансамблем у цэнтры сталіцы, па якім будуць хадзіць натоўпы зацікаўленых турыстаў.

Што асабліва ўсцешыла ў гэтай восеньскай неспадзяванай прагулцы (бо вядома ж, што па горадзе, у якім жывеш, вельмі-вельмі рэдка ўдаецца прайсціся ў якасці зацікаўленага турыста, не спяшаючыся нікуды і не клапоцячыся, каб яшчэ не забыцца купіць хлеба ў краме) — шыльды на старых вуліцах. Для мяне асабіста гэта як даўняя-даўняя мара, якая нарэшце пачала спраўджвацца. Спрадвечныя назвы вуліц сталіцы, дый іншых гарадоў і мястэчак нашай краіны, і сёння ў большасці сваёй схаваныя пад аднолькавымі псеўданімамі ўжо мінулай эпохі. Вярнуць іх у поўнай меры — справа складаная, і не толькі таму, што перайменаванне цягне за сабой значныя выдаткі з бюджэту. Тут яшчэ праблема ў тым, якую з назваў вяртаць. Старажытныя беларускія гарады перажылі як мінімум дзве хвалі перайменаванняў: у XIX стагоддзі, калі ўсё падводзілася пад імперскую ідэалогію вялікай дзяржавы — менавіта тады былі закрыты, а то і ўвогуле разбураныя гарадскія ратушы, а назвы вуліц з каталіцкіх ды уніяцкіх сталі праваслаўнымі. А ў стагоддзі XX і гэтыя найменні сталі недарэчы, і іх замянілі на тыя, што ўшаноўвалі правадыроў рэвалюцыі і новую рэальнасць.

Дый ці варта адмаўляцца ад назваў, якім ужо самім па сабе амаль па сто гадоў? Чым мы будзем лепшыя за тых, хто калісьці рабіў тое самае, якімі б высакароднымі меркаваннямі мы ні кіраваліся? І тое, што, нарэшце, пачалі рабіць у гістарычным цэнтры Мінска, на сёння падаецца самым мудрым крокам. На вуліцы Энгельса, напрыклад, ля старых манастырскіх муроў, у якіх сёння месціцца музычная школа, на белай, заўважнай здалёк шыльдзе напісана, што з XVII стагоддзя вуліца называлася Дамініканскай, з 1866 года — Петрапаўлаўскай, з 1919-га па 1922-гі яна насіла імя Валадарскага і толькі пасля стала вуліцай імя Фрыдрыха Энгельса...

Здавалася б, некалькі назваў, але ж менавіта па іх — прычым па ўсіх разам — можна вывучаць гісторыю і вуліцы, і горада, і ўсёй сваёй краіны. Дамініканская — бо побач, за Палацам Рэспублікі, схаваныя пад зямлёй законсерваваныя рэшткі дамініканскага кляштара. Дрэмлюць, засыпаныя спецыяльным пяском, чакаюць свайго часу: археолагі кажуць, што пры жаданні можна зрабіць сапраўдны музей пад адкрытым небам, як Бярэсце... Пачнеш цікавіцца, чаму менавіта Петрапаўлаўская — да аднайменнага ж храма далёка — і тут знойдзеш адказ. Царква Пятра і Паўла, якую ведаем цяпер, пабудаваная ў 1612 годзе, з канца XVIII стагоддзя была вядомая як Вялікая Кацярынінская, а Петрапаўлаўскі сабор знаходзіўся на сённяшняй плошчы Свабоды і быў узарваны ў 1936 годзе. Вуліца Петрапаўлаўская вяла акурат да яго... «Рэлігійную» назву яна змяніла, як толькі ў Мінску грунтоўна ўсталёўвалася савецкая ўлада: спачатку яе назвалі ў гонар наркама па справах друку, прапагандзе і агітацыі Савецкай рэспублікі В. Валадарскага, забітага ў 1918 годзе эсэрамі ў Петраградзе. Але праз тры гады вуліцу ў цэнтры горада перайменавалі: разам з паралельнай вуліцай Ленінскай (былой Французскай, пасля — Губернатарскай, сёння — Леніна) вуліца Энгельса ўпіралася ў вуліцу імя Карла Маркса (колішнюю Падгорную). Валадарскага ж стала звацца былая Серпухаўская (якая да гэтага была і Лошыцкай, і Астрожнай). Нейтральная, на першы погляд, назва таксама аказалася сімвалам звергнутага царскага рэжыму і патрабавала замены: яна была названая ў 1870 годзе ў гонар Серпухаўскага пяхотнага палка, які на ёй кватараваў...

Вось што здолела расказаць адна невялікая белая шыльда на старой сцяне тысячагадовага без нейкіх там пяцідзесяці гадоў горада. Навошта гэта веданне? Бо без яго ты можаш хоць сто раз пісаць назву гэтага горада месцам свайго нараджэння, але наўрад ці зможаш пачуваць тут сябе сваім. І гэта не толькі пра Мінск. Вельмі хочацца спадзявацца, што сталіца стане прыкладам у вяртанні з небыцця старых назваў вуліц, дый цэлых населеных пунктаў. Не на карты, дык хаця б на шыльды. Каб тыя, хто ходзіць па гэтых вуліцах, чыталі, цікавіліся, ведалі. Каб адчувалі сябе сваімі на сваёй зямлі. Па сённяшнім часе адчуванне надзвычай патрэбнае.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## Извещение о проведении 20 октября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| Предмет торгов №1 |
|---|
| «В 1/к Здание административно-хозяйственное» общей площадью 71,9 кв. м, инв. №в ЕГРНИ 500/С-41417; «Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ Литер Г1/к» общей площадью 34,8 кв. м, инв. №в ЕГРНИ 500/С-41418; электросети (инв. №26/3); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №27/10); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №27/9); кран-балка (инв. №27/8) |
| Площадь земельного участка – 0,1108 га, кадастровый номер 500000000002000714 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 11, 11/1 |
| Начальная цена – 116 626,94 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 11 600,00 бел. руб. |
| **Предмет торгов №2** |
| «Здание административно-хозяйственное, литер А 1/к» общей площадью 472,1 кв. м, инв. №в ЕГРНИ 500/С-11335; «Б 1-2/к Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ» общей площадью 762,6 кв. м, инв. №в ЕГРНИ 500/С-11333; навес каркасный шиферный (инв. №27/2); навес-пристройка каркасный шиферный (инв. №27/3); электросети (инв. №2604); сеть водопроводная (инв. №2603); покрытие площадки асфальтобетонное (инв. №26/2); забор ж/б с воротами металлическими (инв. №26/1); автоматическая установка пожарной сигнализации и оповещения о пожаре (инв. №42795); котел КЧЖ-7-90 «Полымя» (инв. №620/1); котел КВГТ-100 (ТЭМ-100) (инв. №420898); котел TIS UNI 75 (инв. №4000125); забор металлический (инв. №203266); резервуар для хранения нефтепродуктов (инв. №469); стеллажи складские (инв. №27/5); кран-балка (инв. №315) |
| Площадь земельного участка – 0,3237 га, кадастровый номер 500000000002000713 |
| Местонахождение – г. Минск, ул. Бехтерева, 12, 12/1 |
| Начальная цена – 715 931,87 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 71 500,00 бел. руб. |

**Продавец имущества** – ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов** – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

